


Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

# ЗВЯЗДА

1 ВЕРАСНЯ 2012 г. СУБОТА № 169 (27284) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА


# ГЛЫБОКАЯ ПЛЫНЬ ДУХОЎНАСЦІ І АСВЕТЫ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ВУЧНЯМ, СТУДЭНТАМ, АСПІРАНТАМ, НАСТАЎНІКАМ, НАВУКОВА-ПЕДАГАГІЧНЫМ РАБОТНІКАМ

***Дарагія сябры!***

***Ад усёй душы віншую вас з Днём ведаў.***

***Першае верасня — сапраўднае ўсенароднае свята, якое напаўняе хваляваннем сэрца кожнага з нас. У гэты дзень зноў ажываюць класы і аўдыторыі, вуліцы стракацяць яркімі букетамі кветак у руках першакласнікаў, а дарослыя са светлым сумам успамінаюць свае школьныя і студэнцкія гады.***

***У нашай дзяржаве адукацыя ўваходзіць у лік важнейшых сацыяльных прыярытэтаў і з'яўляецца прадметам асаблівай увагі і ўсебаковай падтрымкі. Сучасная Беларусь стварае эканоміку ведаў, развівае ўласную касмічную індустрыю, атамную энергетыку, высокія тэхналогіі, імкнецца быць на перадавых рубяжах навукова-тэхнічнага прагрэсу. І галоўная ўмова цяперашніх і будучых поспехаў краіны — інтэлект і веды яе грамадзян.***

***Звяртаючыся да ўсіх, каму трэба будзе спасцігаць азы навукі, хачу пажадаць не губляць цікавасці да нязведанага, вучыцца з захапленнем, напаўняючы кожны дзень радасцю адкрыццяў. І няхай настойлівасць, прага ведаў і адданасць Айчыне прывядуць вас да ажыццяўлення запаветнай мэты.***

***Паважаныя настаўнікі і выкладчыкі, выказваю вам словы вялікай удзячнасці за вернасць сваёй справе, ініцыятыву і майстэрства, цвёрдую грамадзянскую пазіцыю і беззапаветную любоў да вучняў. Педагагічны корпус краіны быў і застаецца надзейнай апорай дзяржавы.***

***Жадаю ўсім, хто вучыць і вучыцца, здароўя і шчасця, выдатнага настрою, вялікіх дасягненняў і перамог у новым навучальным годзе.***

**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

## ЛІЧБА ДНЯ

**996,486 млн.**

*Br996,486 млн. выдзелена са сродкаў фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва на рэалізацыю шэрагу сацыяльна значных творчых і культуралагічных праектаў. Падпісанне Прэзідэнтам адпаведнага распараджэння з'яўляецца сведчаннем пастаяннай увагі кіраўніка дзяржавы да пытанняў развіцця беларускай культуры і мастацтва, мэтанакіраванай адраснай падтрымкі найбольш важных і значных праектаў у гэтых сферах.*

## НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 25° |
| Віцебск | + 20° |
| Гомель | + 21° |
| Гродна | + 22° |
| Магілёў | + 19° |
| Мінск | + 20° |

## Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 1.09.2012 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8420,00 | ▲ |
| Еўра | 10530,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 258,50 | ▼ |
| Укр. грыўня | 1036,44 | ▲ |


ISSN 1990 - 763X


## АДСВЯТКУЕМ ДЗЕНЬ ПІСЬМЕНСТВА РАЗАМ!

**Сустракацца з чытачамі «Звязда» можа пяць разоў на тыдзень, калі трапляе ў паштовую скрыню ці набываецца ў кіёску. 2 верасня мы будзем яшчэ бліжэй, прынамсі, для нашых падпісчыкаў з Глыбокага, а таксама і для ўсіх іншых гасцей Дня беларускага пісьменства, які сёлета пройдзе менавіта ў гэтым горадзе.**

Праграма свята «Прысвячэнне Году кнігі» вельмі разнастайная і вялікая, усё і не ахопіш. Давядзецца выбраць сёе-тое са спіса адпаведна са сваімі інтарэсамі. У суботу ўсіх запрашае «Паэтычная гасцёўня», прысвечаная творчасці Я. Купалы, Я. Коласа і М. Танка; прыхільнікам гісторыі прапануюць наведаць выставу «Друкаваныя рарытэты», дзе можна будзе паглядзець на старадаўнія кнігі з фондаў Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка. Тэатральная і канцэртная праграмы таксама маюцца: увечары ў Гарадскім цэнтры культуры пакажуць спектакль Беларускага тэатра «Лялька» пад назвай «Загубленая душа, ці Пакаранне грэшніка», а на цэнтральнай плошчы горада чакаецца выступленне ансамбля «Бяседа», пераможцаў тэлепраекта «Великолепная семерка» і іншых артыстаў.

У нядзелю, акрамя афіцыйных адкрыцця і закрыцця Дня беларускага пісьменства, вы зможаце пабываць адразу на некалькіх гасцінных глыбоцкіх падворках: Тэатральным, Моладзевым, Дзіцячым, Спартыўным. Да свята ў Глыбокім «пабудавалі» і некалькі новых трактаў: «Ад агню да пяра», тракт «Шчодрыца», Альгердаў тракт, Святочны, Турыстычны і Тракт нацыянальных культур у гэты дзень будуць чакаць гасцей і весяліць іх кожны на свой лад. Якія забавы падрыхтаваныя там, расказваць не станем. Прыязджайце і самі ўсё паглядзіце.

Запрашаем вас, шаноўныя, і да стэнда «Звязды». Кожны, хто прыйдзе да нас з беларускім словам, атрымае невялікі падарунак. Так што ўспамінайце казкі, песні, вершы на роднай мове і — гайда да нас! Пагаварыць па-беларуску пра жыццё і паслухаць пахвалу ці крытыку мы таксама не супраць. Чакаем усіх, каб адсвяткаваць Дзень пісьменства разам.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

## ВІЛЕНСКІ «БУКВАР» ПРАЗ ТРЫ СТАГОДДЗІ

**ЯКОЙ была адукацыя тры стагоддзі таму? Што яна магла даць свайму пакаленню? І наколькі прыдатнымі яе дасягненні можна лічыць для дня сённяшняга? Факсімільнае выданне Віленскага буквара 1767 года днямі прэзентавалі ў Нацыянальнай бібліятэцы Рэспублікі Беларусь. Адметна і тое, што разам з перавыданнем старой кнігі выйшаў пераклад на сучасную рускую мову з навуковымі каментарыямі.**


СТАР 3




Фота Надзеі БУЖАН

## УДЗЕЛЬНІКАМ І ГАСЦЯМ УРАЧЫСТАСЦЯЎ ДНЯ БЕЛАРУСКАГА ПІСЬМЕНСТВА

***Паважаныя сябры!***

***У дзевятнаццаты раз мы адзначаем Дзень беларускага пісьменства.***

***Сёлета эстафету прымае Віцебскі край, горад Глыбокае. Слаўная сваёй гісторыяй глыбоцкая зямля падаравала свету выдатнага мастака Язэпа Драздовіча, знакамітага тэатральнага дзеяча Ігната Буйніцкага, вядомага авіяканструктара Паўла Сухога.***

***Асаблівасць сённяшніх урачыстых мерапрыемстваў у тым, што яны праходзяць у Год кнігі і ўносяць сваю лепту ў святкаванне 130-годдзя з дня нараджэння нашых класікаў Янкі Купалы і Якуба Коласа.***

***Любоў да мастацкага слова і прага да ведаў спрадвеку былі неад'емнай часткай беларускага менталітэту. На пачатку трэцяга тысячагоддзя кніга па-ранейшаму застаецца для нас крыніцай вопыту, натхнення, шчырай любові да роднай зямлі. Менавіта сапраўдны патрыятызм, інтэлект і духоўнасць дапамогуць нам пабудаваць шчаслівую, моцную краіну.***

***Сардэчна жадаю ўдзельнікам і гасцям свята здароўя, поспехаў у працы і дабрабыту.***

**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**


**Хорошую новость для всех, кто нуждается в улучшении жилищных условий, сообщает ОАО «АСБ Беларусбанк»:**

БЕЛАРУСБАНК 90 лет

**КРЕДИТЫ НА СТРОИТЕЛЬСТВО (РЕКОНСТРУКЦИЮ) И ПРИОБРЕТЕНИЕ ЖИЛЬЯ СУЩЕСТВЕННО СНИЖАЮТСЯ В ЦЕНЕ.**

**С 3 сентября 2012 года** ставка по вновь выдаваемым физическим лицам кредитам на строительство (реконструкцию) и приобретение жилья на условиях, определенных банком для граждан, нуждающихся в улучшении жилищных условий, составит **20% годовых**, а для многодетных семей — **17% годовых**.

Кредиты предоставляются без взимания комиссий за рассмотрение пакета документов и сопровождение кредитов.

Очередное в этом году значительное удешевление «Беларусбанком» стоимости своих кредитов направлено на повышение их доступности для населения.

Снижение процентных ставок по кредитам позволит многим семьям быстрее улучшить свои жилищные условия, стать новоселами.

Мы всегда рядом и свою социальную ответственность подтверждаем на деле.

Информационная поддержка на корпоративном веб-сайте банка **www.belarusbank.by** и по телефону **Контакт-центра – 147.**

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.*


## КОРАТКА

У Беларусі адпрацоўваюцца схемы для арганізацыі другаснага працаўладкавання моладзі ў навучальны перыяд, паведаміў міністр адукацыі Сяргей Маскевіч. Па стане на 1 жніўня 2012 года ў складзе студэнцкіх атрадаў Беларусі працаўладкаваны 23 358 маладых людзей, індывідуальна працаўладкаваны больш як 70 тыс. чалавек, у складзе валанцёрскіх атрадаў — 32 571 чалавек.

У Беларусі спросцяць санітарна-эпідэміялагічныя патрабаванні для гандлёвых аб'ектаў грамадскага харчавання. Новыя санітарныя правілы ўступяць у сілу 6 верасня гэтага года.

З 3 верасня ў мінскім метро інтэрвал руху цягнікоў у час пік будзе скарочаны да 2 хвілін.

Тарыфная стаўка першага разраду для аплаты працы работнікаў бюджэтных арганізацый і іншых арганізацый, якія атрымліваюць субсідыі, работнікі якіх прыраўнаваны па аплаце працы да работнікаў бюджэтных арганізацый, павышаецца з 1 верасня 2012 года на 7,1 працэнта да Br225 тыс.

## ДАПАМОГІ НА ДЗЯЦЕЙ: ЧАКАЮЦЦА НОВАЎВЯДЗЕННІ

**У нашай краіне распрацаваны праект закона «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей». Зараз гэты дакумент знаходзіцца на разглядзе ва ўрадзе. Плануецца, што закон будзе прыняты ў 2013 годзе. Якія запланаваны новаўвядзенні?**

Адна з галоўных навін закона заключаецца ў тым, што дапамога па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў будзе прывязана да сярэднямесячнай зарплаты па рэспубліцы. Гэта пацягне павелічэнне яе памеру прыблізна на 40-50%. Плануюцца наступныя павышэнні памеру дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў: дапамога на першае дзіця будзе дасягаць 35% сярэднямесячнай заработнай платы ў рэспубліцы, на другое і наступных дзяцей — 40% сярэднямесячнай заработнай платы ў рэспубліцы. Пра гэта паведаміла **кансультант упраўлення народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Святлана БЕЛАШ.**

Яшчэ адно з новаўвядзенняў закона будзе тычыцца адзінокіх маці. Сёння да дапамог на дзяцей, народжаных жанчынамі па-за шлюбам, калі звесткі пра бацьку дзіцяці ў запісе акта аб нараджэнні зроблены па ўказанні маці, дадаткова прызначаюцца і выплачваюцца 75-працэнтныя надбаўкі ад памеру дапамогі на дзяцей ва ўзросце да паўтара года і 40% ад памеру дапамогі на дзяцей ва ўзросце больш за паўтара года. Для параўнання: памер дапамогі на дзіця ва ўзросце да паўтара года з 1 жніўня складае 843.870 рублёў, а ў выпадку нараджэння дзіцяці па-за шлюбам — 1.476.770 рублёў. Памер дапамогі на дзіця ва ўзросце, старэйшым за паўтара года, народжанага па-за шлюбам, складае 1.181.420 рублёў.

Новы закон прадугледжвае ўзмацненне прынцыпу адраснасці ў аказанні дапамогі і будзе накіраваны на стымуляванне нараджэння і выхавання дзяцей у поўных сем'ях. Разам з тым, як адзначаюць прадстаўнікі ўпраўлення народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, сем'і, якія па аб'ектыўных прычынах маюць патрэбу ў дапамозе дзяржавы, таксама не будуць пакінутымі без увагі.

**Святлана БУСЬКО.**

# З 1 ВЕРАСНЯ СПРАШЧАЮЦЦА ПРАЦЭДУРЫ АДАБРАННЯ СТАРЫХ І ПУСТУЮЧЫХ ЖЫЛЫХ ДАМОЎ У ВЁСЦЫ

**У Беларусі з 1 верасня 2012 года спрашчаюцца працэдуры адабрання пустуючых і старых жылых дамоў у сельскай мясцовасці, паведамляе БЕЛТА.**

З гэтай даты ўступае ў сілу ўказ № 100 «Аб мерах па ўдасканаленні ўліку і скарачэнні колькасці пустуючых і старых дамоў у сельскай мясцовасці», прыняты 23 лютага 2012 года.

Старымі лічацца жылыя дамы, размешчаныя ў сельскай мясцовасці, прызнаныя не адпаведнымі санітарным і тэхнічным патрабаванням або непрыдатнымі для пражывання, адносна якіх на 1 студзеня кожнага каляндарнага года ёсць дакладныя звесткі аб тым, што яны ўтрымліваюцца безгаспадарча, асобы, якія маюць права карыстання імі, на працягу апошняга года не пражываюць у іх і не прымаюць мер да аднаўлення гэтых дамоў для выкарыстання па прызначэнні.

Да ліку пустуючых могуць быць аднесены жылыя дамы, размешчаныя ў сельскай мясцовасці, адносна якіх на 1 студзеня кожнага года ёсць дакладныя звесткі аб тым, што на працягу апошніх трох гадоў запар асобы, якія маюць права карыстання імі, пражываюць у іх у сукупнасці менш як адзін месяц у год, і адносна якіх не прадстаўлены пісьмовыя паведамленні аб намеры выкарыстоўваць іх для пражывання.

Дзеючая раней практыка паказвала, што выяўляць і забіраць такія дамы даволі складана і доўга. З 1 верасня 2012 года мясцовым выканкамам стане прасцей гэта рабіць і выстаўляць такія пустуючыя дамы на продаж або перадаваць іх бясплатна. Указ № 100 прадугледжвае новы механізм перадачы безгаспадарных будынкаў інвестарам. Дамы, якія на працягу апошніх трох гадоў не выкарыстоўваюцца для пастаяннага пражывання, мясцовыя ўлады могуць аднесці да пустуючых, для чаго іх уладальнікам накіроўваюць паведамленні аб уключэнні будынка ў адпаведны рэгістр.

Выканаўчы камітэт базавага тэрытарыяльнага ўзроўню вядзе рэгістр уліку пустуючых дамоў, якія знаходзяцца ў сельскай мясцовасці. Для фарміравання рэгістра выканкам стварае камісію па абследаванні стану жылых дамоў, размешчаных у сельскай мясцовасці на тэрыторыі адпаведнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі.

У склад камісіі ўключаюцца намеснік старшыні выканкама базавага тэрытарыяльнага ўзроўню, кіраўнікі і спецыялісты структурных падраздзяленняў гэтага выканкама, якія павінны забяспечваць рэалізацыю дзяржаўнай палітыкі ў сферы будаўніцтва, архітэктуры і жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Таксама ў камісію ўваходзяць прадстаўнікі органаў унутраных спраў, выканаўчых камітэтаў першаснага тэрытарыяльнага ўзроўню, землеўпарадкавальнай службы мясцовага выканкама, тэрытарыяльнай арганізацыі па дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёю.

Камісія праводзіць агляд жылога дома і, калі выявіць, што ён адпавядае крытэрыям пустуючага дома, складае заключэнне аб яго стане. Сюды ўключаюцца звесткі аб месцазнаходжанні пустуючага дома, пералік асоб, якія маюць на яго права карыстання, у тым ліку пазначаецца асоба, якой гэты дом належыць на праве ўласнасці, гаспадарчага ведання або аператыўнага кіравання. Даецца поўная характарыстыка дома: яго памеры, плошча, дата ўводу ў эксплуатацыю ў выпадку наяўнасці гэтых звестак, састаўныя часткі дома, звесткі аб зямельным участку. Пры наяўнасці ў пустуючым доме рухомай маёмасці камісія складае яе вопіс, які прыкладаецца да заключэння.

Такім чынам, рэалізацыя норм указа будзе садзейнічаць актывізацыі работы мясцовых выканкамаў па выяўленні жылых дамоў у сельскай мясцовасці, што безгаспадарча ўтрымліваюцца (пустуючых і старых), скарачэнню іх колькасці і добраўпарадкаванню сельскіх населеных пунктаў.

Для рэалізацыі ўказа № 100 прынята пастанова Савета Міністраў ад 22 жніўня 2012 года № 774, якой унесены змяненні і дапаўненні ў Палажэнне аб парадку абследавання стану жылых памяшканняў, прызнання іх не адпаведнымі санітарным і тэхнічным патрабаванням, якія прад'яўляюцца да жылых памяшканняў, непрыдатнымі для пражывання, зацверджанае пастановай ад 7 верасня 1999 года № 1392.

# ГРОШЫ НА ШКОЛУ

**Улады Магілёўскай вобласці прынялі рашэнне матэрыяльна падтрымаць усіх школьнікаў са шматдзетных сем'яў.**

Дапамогу да новага навучальнага года атрымаюць значна больш шматдзетных сем'яў у рэгіёне, чым гэта планавалася раней. Са жніўня дзяржаўныя выплаты атрымлівалі сем'і, дзе выхоўваюцца трое і больш дзяцей, якія навучаюцца ў агульных сярэдніх і спецыяльных навучальных установах.

Паводле новага рашэння Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў, матэрыяльную дапамогу цяпер атрымаюць і тыя шматдзетныя сем'і, дзе ёсць адзін ці два школьнікі. Да 1 верасня з мясцовых бюджэтаў на кожнага навучэнца выплацяць 30% пражытковага мінімуму, альбо 253 тысячы 160 рублёў. Такую падтрымку атрымаюць каля 7 тысяч школьнікаў, а агульная ж сума перавысіць 1,5 мільярда рублёў.

**Ілона ІВАНОВА.**

# КАНТОРКА Ў ШКОЛЬНЫМ ІНТЭР'ЕРЫ

**У школах Мінска пачалі з'яўляцца канторкі — від мэблі, якая знешне нагадвае кафедру. Канторкі адрозніваюцца ў залежнасці ад узросту дзяцей. Сёння такой мэбляй забяспечаны ўжо 19 % школ сталіцы, паведаміла на прэс-канферэнцыі загадчык аддзела гігіены дзяцей і падлеткаў Мінскага гарадскога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Валянціна ЖЫХАР.**

Канторкі дазваляюць дзецям падчас навучальнага працэсу зняць статычнае напружанне. Гэта важна для прафілактыкі парушэнняў у косна-мышачнай сістэме, пры ўзнікненні скаліёзаў і парушэннях паставы. Іх выкарыстанне станоўча адбіваецца і на зроку, таму што дзіця, карыстаючыся такой мэбляй, глядзіць на напісанае на дошцы, але з іншай адлегласці, бо канторкі ставяцца ў класе ці недзе ззаду, ці збоку, але такім чынам, каб не перашкаджаць іншым вучням. Знаходзіцца за канторкай можна пры жаданні ад пяці да пятнаццаці хвілін. Трапіць туды можна як па ўласным жаданні, так і па накіраванні настаўніка, калі дзіця з ліку гіперактыўных і тым самым парушае дысцыпліну.

Як было агучана, у краіне будзе распрацавана праграма па вытворчасці такой мэблі. Да ўсяго, звычайная школьная мэбля, якая складаецца са стала і крэсла, будзе заменена на парты. Парты — больш «здаровая» мэбля. Яна дапамагае правільна вытрымліваць адлегласць паміж сталом і вучнем пры сядзенні. Калі дзіця абапіраецца на спінку, знаходзячыся за партай, то гэта дазваляе пазбегнуць статычнага напружання.

Адносна арганізацыі перапынкаў важна, каб была нададзена магчымасць рухавай актыўнасці. Як зазначыла Валянціна Жыхар, падчас маніторынгаў у школах назіралася: ужо напрыканцы чвэрці дзеці — стомленыя, што сведчыць аб нізкай адаптацыі да навучальнага працэсу. Па магчымасці дзеці павінны праводзіць перапынкі на свежым паветры, а не за гульнямі на планшэце ці на мабільным тэлефоне. Асаблівай увагі патрабуюць урокі фізічнай культуры для дзяцей, якія па стане здароўя не могуць на роўных займацца з іншымі. Неабходна арганізаваць асобныя групы, дзе займаліся б такія дзеці.

Актуальным застаецца таксама пытанне пераносу вучнямі цяжару ў сваіх партфелях. Бацькам трэба ведаць, што па нормах дзіця не павінна пераносіць больш за дзесяць працэнтаў ад сваёй агульнай вагі. Каб разгрузіць школьныя партфелі, санітарным заканадаўствам прадугледжаны ў класах пачатковай школы спецыяльныя шафкі, дзе дзеці мелі б магчымасць захоўваць рэчы для ўрокаў малявання, фізічнай культуры, а таксама кнігі, якія не выкарыстоўваюцца кожны дзень. Калі адносна пачатковых школ гэтае пытанне вырашана, то для навучальных установ наогул яно вырашаецца падчас капітальных рамонтаў. Як прыклад, 137-я школа горада Мінска пасля яго ўжо абсталявана такімі шафамі з персанальнымі ключамі для кожнага вучня, каб захоўваць усё неабходнае.

**Алена ДРАПКО.**

# НОВЫ ЖЫЛЛЁВЫ КОДЭКС УВОДЗІЦЬ РЭАЛЬНАЕ ПАНЯЦЦЕ ЎЛАСНІКА З КАНКРЭТНЫМІ ПРАВАМІ І АБАВЯЗКАМІ

**НОВЫ Жыллёвы кодэкс уводзіць рэальнае паняцце ўласніка з канкрэтнымі правамі і абавязкамі, лічыць старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па жыллёвай палітыцы, будаўніцтве, гандлю і прыватызацыі Галіна ПАЛЯНСКАЯ, каментуючы новую рэдакцыю кодэкса, якая была зацверджана кіраўніком дзяржавы.**

Самым галоўным у дакуменце дэпутат лічыць вызначэнне канкрэтных правоў і абавязкаў уласніка. «Раней існавала паняцце ўласніка, аднак ніхто па-сапраўднаму ім сябе не адчуваў. Цяпер новая рэдакцыя дакумента дасць магчымасць увесці рэальнае паняцце ўласніка з прапісанымі нормамі, якія прадастаўляюць яму пэўныя правы і накладаюць абавязкі», — адзначыла Галіна Палянская.

У новым Жыллёвым кодэксе больш дакладна прапісаны пытанні, што датычацца ажыццяўлення ў дамах капітальнага рамонту. «Упершыню на заканадаўчым узроўні прапісана, што складаць графік работ на бягучы год і інфармаваць грамадзян неабходна загадзя, а таксама абавязкова падпісваць дагаворы з жыльцамі на аказанне паслуг па капрамонце», — растлумачыла старшыня пастаяннай камісіі. На яе думку, юрыдычнае рэгуляванне дасць магчымасць дакладна арганізаваць правядзенне капітальнага рамонту жылога фонду. Дакументам таксама вызначаны падставы неабходнасці правядзення капрамонту дома.

У новай рэдакцыі кодэкса прапісана ажыццяўленне налічэнняў платы за жыллёва-камунальныя паслугі. «Акрамя тэрмінаў прадастаўлення грамадзянам жыровак і тэрмінаў іх аплаты, дакументам вызначана неабходнасць пазначаць у плацежных дакументах тарыфы на аказанне ЖКП, аб'ёмы і грашовыя сумы аказаных паслуг, іх пералік па кожным шматкватэрным доме», — адзначыла дэпутат. Гэта дасць магчымасць уласнікам кватэр кантраляваць расход грашовых сродкаў і абавяжа выканаўцаў паслуг па абслугоўванні дома ставіцца да сваёй работы больш адказна.

Паводле слоў Галіны Палянскай, новы Жыллёвы кодэкс дасць магчымасць актывізаваць дзейнасць беларускіх банкаў па выдачы насельніцтву іпатэчных крэдытаў. «Дакумент рэалізуе пазіцыю закона аб іпатэцы, якая прадастаўляе банкам магчымасць высялення ўласніка і пражываючых з закладзенага памяшкання пры накіраванні спагнання на гэта памяшканне і прыняцці судом рашэння аб спыненні права ўласнасці», — растлумачыла парламентарый. Калі ў сям'і ёсць непаўналетнія грамадзяне, прызнаныя ў сацыяльна небяспечным становішчы або якія маюць патрэбу ў дзяржаўнай абароне, то суд павінен прымаць рашэнне аб адчужэнні кватэры з улікам папячыцельскіх органаў і органаў апекі. «Гэта магчымасць прадастаўляецца банкам і судам толькі ў тых выпадках, калі чалавек сістэматычна не плаціць па іпатэчным крэдыце», — падкрэсліла яна. Гэта норма, паводле слоў дэпутата, не зможа вырашыць усе пытанні адносна работы механізму іпатэкі, але ўрэгулюе іх частку, якая адносіцца да банкаўскага сектара.

Прадугледжана таксама магчымасць прымусовага высялення ўласніка кватэры пры пэўных абставінах, у тым ліку калі маецца без уважлівых прычын шасцімесячная запазычанасць за жыллёва-камунальныя паслугі, невыкананне абавязкаў па ўтрыманні жылога памяшкання, што робіць немагчымым пражыванне побач іншых людзей у доме, кватэры.

**БЕЛТА.**

## АГОНЬ У КРЭПАСЦІ

Пра пажар у будынку старой крэпасці па вуліцы Карбышава ў Бабруйску стала вядома а палове чацвёртай гадзіны дня ад выпадковага відавочцы.

На месцы падраздзяленні МНС убачылі, што адкрытым полымем гарыць дах будынка, які ўваходзіць у састаў мемарыяльнага комплексу «Бабруйская крэпасць» 1752 года пабудовы і з'яўляецца помнікам архітэктуры рэспубліканскага значэння. Да 2004 года тут знаходзілася гаўптвахта, а пасля будынак не эксплуатаваўся. У выніку пажару было пашкоджана 200 квадратных метраў даху. Як мяркуецца, прычына пажару — неасцярожнае абыходжанне з агнём. Вінаватая асоба ўстанаўліваецца.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# «НЯХАЙ ДАПАМАГАЕ «ЗВЯЗДЗЕ» СВЯТАЯ САФІЯ СЛУЦКАЯ!»

**ДАЧКА мінскага падпольшчыка Мікалая Каржанеўскага, які ўдзельнічаў у распаўсюджванні падпольнай «Звязды» ў акупаваным Мінску, перадала ў дар газеце ікону святой праведнай Сафіі Слуцкай.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Мабыць, у жыцці не бывае нічога выпадковага. Галіна Мікалаеўна Каржанеўская працуе бібліятэкарам у храме святой праведнай Сафіі Слуцкай — а храм пабудаваны якраз на вуліцы Мікалая Каржанеўскага, яе бацькі.

І бацька, і матуля загінулі ў фашысцкіх засценках у 1942 годзе. Галіна іх не памятае: была зусім маленькай — усяго тры гадкі...

— Вельмі ўдзячная газеце за памяць пра бацьку, — гаворыць Галіна Мікалаеўна. — «Звязда» прыходзіць у наш дом як іскра дабрыні. Родная мова нас саграве. Кожны нумар газеты я адношу ў храм. Увогуле хачу стварыць там беларускамоўны куточак. Сёлета адзначаецца 400-годдзе прастаўлення святой праведнай Сафіі Слуцкай, вялікай патрыёткі зямлі беларускай. Няхай жа яна аберагае-ахоўвае газету, усіх чытачоў ад бед і непрыемнасцяў. Дарэчы, рамку да іконы зрабіў прыхаджанін Аляксандр Піліпавіч Сякірын, ён вельмі дапамагае храму.

**НА ЗДЫМКУ: Галіна Каржанеўская перадае ікону святой праведнай Сафіі Слуцкай намесніку галоўнага рэдактара Таццяне Падаляк, якая на працягу многіх гадоў займаецца гісторыяй падпольнай «Звязды».**

## ■ Здарэнні

### ПРАЦЯГНУЎ КАНІКУЛЫ

Апошнія летнія дні дзесяцікласнік з Жыткавіч скарыстаў, каб пакатаць на бацькоўскім аўтамабілі сяброў. Аднак 16-гадовы падлетак не справіўся з кіраваннем, з'ехаў на абочыну і перакуліўся. У выніку начнога здарэння ўсе трое апынуліся на бальнічных ложках.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ** ■

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## СЁННЯ СПЫНЯЕЦЦА ВЫПУСК У АБАРАЧЭННЕ БАНКНОТ НАМІНАЛАМ 10 І 20 РУБЛЁЎ

Такое рашэнне прынята з мэтай скарачэння дзяржаўных выдаткаў на выраб гэтых купюр, з-за немэтазгоднасці далейшага іх выкарыстання ў наяўным грашовым абарачэнні, паведамляе ўпраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацыянальнага банка.

Гэтыя банкноты ўзору 2000 года застануцца ў абарачэнні да 28 лютага 2013 года. Да гэтага часу купюры ў 10 і 20 рублёў абавязковыя да прыёму пры ўсіх відах плацяжоў без усялякіх абмежаванняў. Абмяняць банкноты можна будзе без камісіі ў любой суме, кратнай 50 рублям: з 1 сакавіка па 30 верасня 2013 года ўключна — у Нацыянальным банку Рэспублікі Беларусь і банках краіны; з 1 кастрычніка 2013 года па 31 сакавіка 2014 года ўключна — у Нацыянальным банку Рэспублікі Беларусь.

З 1 красавіка 2014 года гэтыя банкноты будуць зняты з абарачэння і будуць лічыцца несапраўднымі.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

## У СВІСЛАЦКІМ РАЁНЕ ЗУБР АТАКАВАЎ ГРЫБНІКА

У Свіслацкім раёне зубр атакаваў грыбніка, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў Свіслацкім РАНС.

Інцыдэнт адбыўся ў лясным масіве недалёка ад пасёлка Поразава. Мясцовы жыхар, супрацоўнік раённага аддзела па НС, у свой выхадны адправіўся па грыбы. Паводле яго слоў, у лесе ў гэты дзень было даволі шмат людзей. Паглыбіўшыся ў масіў, ён убачыў на сцежцы за 4 м ад сябе зубра. Мясцовыя жыхары ведаюць, што жывёлы свабодна ходзяць у лесе, аднак яны звычайна трымаюцца крыху далей і статкамі, да людзей смела не падыходзяць. Калі грыбнік паспрабаваў даць задні ход, зубр наблізіўся, падхапіў мужчыну за куртку на рогі і пачаў трэсці. Куртка парвалася, а пацярпелы ўпаў. Тады зубр некалькі разоў ударыў капытамі ў вобласць груднай клеткі. Грыбнік абараняўся кошыкам. Неўзабаве, зрэагаваўшы, відаць, на гучны крык ахвяры, зубр павярнуўся і пайшоў.

Мужчына вярнуўся дадому з рознымі пашкоджаннямі і ўдарамі, кваліфікаваная медыцынская дапамога не спатрэбілася. Пра гэты інцыдэнт ён паведаміў у лясніцтва. Поразаўскае лясніцтва ўваходзіць у склад ДВУ «Нацыянальны парк «Белавежская пушча», на яго тэрыторыі таксама размешчаны зубрагадавальнік.

**БЕЛТА.**

# У ЧЫТАЛЬНАЙ ЗАЛЕ З ГУБЕРНАТАРАМ

## Акцыю абласной бібліятэкі «Брэст чытае дзецям» распачаў старшыня Брэсцкага аблвыканкама Канстанцін Сумар

2012 ГОД КНІГІ

**У Год кнігі абласная бібліятэка Брэста асаблівую ўвагу надае рабоце з юным чытачом. Менавіта для таго, каб захапіць жаданнем чытаць школьнікаў, была задумана акцыя «Брэст чытае дзецям». На сустрэчу з вучнямі прыходзяць кіраўнікі розных рангаў, вядомыя на Брэстчыне людзі, творчыя асобы, каб пачытаць свае любімыя радкі, пагаварыць пра жыццё. Адкрыў шэраг цікавых мерапрыемстваў губернатар вобласці Канстанцін Сумар.**

У аўдыторыі, якую склалі вучні гімназіі №1, іншыя актыўныя чытачы бібліятэкі, Канстанцін Андрэевіч прачытаў урывак з кнігі Анатоля Бутэвіча «Званы Нямігі», а дакладней, раздзел пад назвай «Камянецкая вежа». Далей размова пайшла пра нашу гісторыю і культуру, мову і духоўную спадчыну народа — рэчы надзвычай важныя для выхавання грамадзяніна і патрыёта сваёй Радзімы. Дзеці задавалі шмат пытанняў кіраўніку рэгіёна. А вось з адказам на адно з іх: «Якім вы бачыце Брэст праз 30-40 гадоў?» — дарослы суразмоўца не спяшаўся. Ён прапанаваў паразважаць і выказаць свае меркаванні. І школьнікі не сароміліся даваць волю фантазіі, заадно дэманструючы свой узровень ведаў гісторыі і сучаснасці Брэста. Размова атрымалася шчырай, цікавай. Падчас сустрэчы губернатар па памяці чытаў радкі паэтаў Брэстчыны, а таксама любімыя строфы з лірыкі Максіма Багдановіча.



У гэты ж дзень кнігі ў падарунак з рук кіраўніка вобласці атрымала самая чытаючая сям'я брастаўчан — Ірына і Вячаслаў Сталяровы і іх дочкі Вера, Аліна, Ганна, Надзея. Фонд бібліятэкі папоўніўся даведнікамі, энцыклапедыямі, дзіцячай літаратурай, якія атрымалі ў дар ад аблвыканкама.

Пазней у гасцях у юных інтэлектуалаў з любімымі творамі пабывалі рэктар Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна Мечыслаў Часноўскі, пракурор вобласці (цяпер пракурор горада Мінска) Сяргей Хмарук, брэсцкі пісьменнік Іван Арлоў.

Паводле слоў намесніка дырэктара Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М. Горкага Алы Мяснянкінай, на сустрэчу з дзецьмі ў бліжэйшы час збіраюцца начальнік абласнога УУС Уладзімір Сычэўскі, дырэктар мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой» Рыгор Бысюк, намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Леанід Цупрык. Акцыя працягваецца.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

**НА ЗДЫМКУ: падчас сустрэчы Канстанціна Сумара з чытачамі.**

**Калектыў Дзяржаўнага вытворчага аб'яднання электраэнергетыкі «Белэнерга» выказвае глыбокае спачуванне родным і блізкім у сувязі са смерцю былога начальніка Беларускага тэрытарыяльнага энергетычнага аб'яднання Мінэнерга СССР ХАРТАНОВІЧА Георгія Мікалаевіча.**

**Калектыў Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства электраэнергетыкі «ОДУ» выказвае глыбокае спачуванне родным і блізкім у сувязі са смерцю былога начальніка Беларускага тэрытарыяльнага энергетычнага аб'яднання Мінэнерга СССР ХАРТАНОВІЧА Георгія Мікалаевіча.**

# КАЛІ Б ВЯСКОВЕЦ ЗВЯРНУЎСЯ ПА СЕНА РАНЕЙ...

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

**З вёскі Котра Гродзенскага раёна патэлефанаваў вясковец, які трымае дзвюх кароў: мясцовая гаспадарка не дае сена. Па словах заяўніка, усім навокал па тоне прывезлі, а да яго чарга так і не дайшла. Звяртаўся з гэтай нагоды і ў сельскі Савет, які складае спісы ахвотных атрымаць тое сена, і ў саму гаспадарку — напісаў заяўку, але жаданага так і не дачакаўся.**

— Па-першае, не так і шмат зараз вяскоўцаў трымаюць рагуль, тым больш — дзвюх адразу. Па-другое, мы ж здаём дзяржаве малако. Ну дык чаму ж не пайсці такім, як я, насустрач? — задаў сваё пытанне заяўнік.

Каб разабрацца ў сітуацыі, мы патэлефанавалі галоўнаму аграному СВК «Абухава» Віктару Кузьміцкаму. Выслухаўшы сутнасць звароту, той папрасіў колькі часу для ўдакладнення звестак, пасля чаго паведаміў нам наступнае.

— Першым чынам мы выдзяляем сена для сваіх работнікаў, а таксама для пенсіянераў, якія пайшлі на заслужаны адпачынак пасля працы ў нашай гаспадарцы. Ветэранам — бясплатна, тым, хто працуе зараз — за грошы.

Ваш заяўнік у гаспадарцы не працуе і не працаваў. Сама вёска Котра не адносіцца да тэрыторыі нашага СВК. Больш за тое, наколькі мне вядома, гэты вясковец увогуле ўпершыню звярнуўся да нас з пытаннем адносна сена — раней такога не было, хоць кароў ён трымае, напэўна, гадоў пятнаццаць, — распавёў Віктар Міхайлавіч. — Але, у прынцыпе, гэта не праблема: на платнай аснове гаспадарка магла б дапамагчы з сенам любому чалавеку, нават калі ён не з'яўляецца ні работнікам СВК, ні пенсіянерам, што аддаў яму гады жыцця. Калі б не адно «але»... Ваш заяўнік звярнуўся з просьбай позна — 25 жніўня. Для чалавека, які трымае дзвюх рагуль, гэта тым больш дзіўна. А сена на палях ужо няма. Калі б ён папрасіў выдзеліць яго раней, ніякіх праблем не было б: сена хапала. Вядома, нейкі запас гаспадарка стварыла. Але браць яго са сцірты, з сенасховішча... Тым больш сёння ў гаспадарцы — зусім іншыя задачы і клопаты. Зрэшты, шанцы ў вашага заяўніка, напэўна, ёсць. Але рашэнне павінен прымаць старшыня гаспадаркі, які зараз у водпуску. Вернецца з яго — няхай вясковец паспрабуе звярнуцца да яго з просьбай.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ, НАХОДЯЩИХСЯ В РЕСПУБЛИКАНСКОЙ СОБСТВЕННОСТИ

**Аукцион состоится 13 сентября 2012 г. в 12.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 106.**
**Организатор аукциона: фонд «Могилевоблимущество», г. Могилев, ул. Первомайская, 62, тел. 8(0222)229022, 311185, 223375.**
**Продавец недвижимого имущества: Государственное учреждение «Бобруйское эксплуатационное управление Вооруженных Сил», тел. 8(0225) 481011.**

Аукцион проводится в соответствии с Декретом Президента Республики Беларусь от 7 мая 2012 г. № 6 «О стимулировании предпринимательской деятельности на территории средних, малых городских поселений, сельской местности» и Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и земельного участка в частную собственность или права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 15.00 в фонде «Могилевоблимущество» по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 104, начиная с со дня публикации извещения. Последний день приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами **11 сентября 2012 г. с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 15.00.** Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе.

Заключительная регистрация участников аукциона в фонде «Могилевоблимущество» **13 сентября 2012 г. с 10.00 до 10.50.**

| № лота | Сведения о неиспользуемом имуществе | | | Информация о земельном участке | | Размер задатка, тыс. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Наименование и краткая характеристика | Место нахождения | Начальная цена недвижимого имущества, тыс. руб. | Площадь, га | Срок аренды, лет | |
| 1 | Пункт технического обслуживания в т.ч. котельная площадью 750,6 кв.м, фундамент бетонный, стены кирпичные, перекрытие – железобетонные плиты, кровля совмещенная, полы бетонные; дымовая труба металлическая на кирпичном фундаменте высотой 25 м; мощение бетонное площадью 86 кв.м, мощение асфальтобетонное 2622 кв.м, бортовой камень бетонный, протяженностью 61,86 м, сеть водопровода протяженностью 197,0 м и кабельная линия протяженностью115,4 м. | Могилевская область, Осиповичский р-н, военный городок № 4 «В» «Верейцы» | 447 066,108 | 0,4921 | 20 | 40 000,0 |

Полная информация об условиях участия в аукционе и порядке его проведения ранее была опубликована в газете «Звязда» 10 июля 2012 г.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до его проведения, при этом объявление об отказе от проведения аукциона публикуется в газете «Звязда».

Победитель (единственный участник) аукциона в течение 10 рабочих дней после дня проведения аукциона (утверждения протокола) обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого участка, на счета получателей, указанные в протоколе аукциона.

Срок заключения договора купли-продажи недвижимого имущества и договора аренды земельного участка – не позднее 2 рабочих дней со дня возмещения вышеназванных затрат. При уклонении одной из сторон от заключения договора купли-продажи недвижимого имущества или договора аренды земельного участка другая сторона вправе обратиться в суд с требованием о понуждении заключить договор, а также о возмещении убытков, причиненных уклонением от его заключения. Договор аренды земельного участка и возникновение основанного на нем права аренды подлежат государственной регистрации в соответствии с законодательством.

Оплата за недвижимое имущество осуществляется денежными средствами по безналичному расчету без предоставления рассрочки. Оплата за объекты недвижимости производится в течение 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи имущества.

Информация об объектах, предлагаемых к продаже, размещена на сайтах Могилевского областного исполнительного комитета **region.mogilev.by** и Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **gki.gov.by**.



## Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ НАСТУПНЫХ ПАСАД:

- кафедра філасофіі: старшы выкладчык;
- кафедра псіхалогіі і педагогікі: прафесар;
- кафедра замежных моў: старшы выкладчык;
- кафедра тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый: старшы выкладчык, дацэнт;
- кафедра менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы: дацэнт (3), прафесар;
- кафедра інфармацыйных рэсурсаў: старшы выкладчык (2), дацэнт (2);
- кафедра культуралогіі: старшы выкладчык, дацэнт (2);
- кафедра менеджменту сацыяльна-культурнай дзейнасці: старшы выкладчык, дацэнт (2);
- кафедра педагогікі сацыякультурнай дзейнасці: дацэнт;
- кафедра міжкультурных камунікацый: старшы выкладчык;
- кафедра беларускай і сусветнай мастацкай культуры: дацэнт (2);
- кафедра інфармацыйных тэхналогій у культуры: дацэнт (2);
- кафедра тэорыі музыкі і музычнай адукацыі: дацэнт;
- кафедра мастацтва эстрады: выкладчык (2); старшы выкладчык;
- кафедра харавога і вакальнага мастацтва: дацэнт (2);
- кафедра народна-інструментальнай творчасці: выкладчык, дацэнт (2);
- кафедра духавой музыкі: старшы выкладчык (2);
- кафедра беларускай народна-песеннай творчасці: старшы выкладчык, дацэнт, загадчык кафедры;
- кафедра этналогіі і фальклору: выкладчык;
- кафедра тэатральнай творчасці: дацэнт, прафесар;
- кафедра рэжысуры абрадаў і святаў: дацэнт (2);
- кафедра народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва: выкладчык, дацэнт;
- кафедра харэаграфіі: старшы выкладчык, дацэнт (2);
- кафедра рускай мовы як замежная: выкладчык, старшы выкладчык.

**Наш адрас: 220001, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17. Аддзел кадраў.** УНП 100286677

# ГЛЫБОЧЧЫНА: УЗВЫШАНАЕ І ЗЯМНОЕ

Фотапогляд Анатоля КЛЕШЧУКА.







# ВІЛЕНСКІ «БУКВАР» ПРАЗ ТРЫ СТАГОДДЗІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Над выданнем працавалі на працягу некалькіх гадоў. Зараз яно з'яўляецца першым значным праектам Апякунскага савета Нацыянальнай бібліятэкі і прадстаўніцтва кампаніі «XEROX» у Рэспубліцы Беларусь. Буквар стаў першым значным крокам на шляху папулярызацыі кніжнай спадчыны нашай краіны.

Узноўлены «Буквар», акрамя алфавіта, складоў, лічбаў, змяшчае яшчэ і малітвы, павучэнні, гімны. А таксама такія цікавыя раздзелы, як «Надрадковыя знакі прыпынку», «Для выпраўлення мовы отракаў», «Павучэнні дзецям пра тое, як шанаваць бацькоў», «Восем евангельскіх вышэйшых асалод», «Тры душэўныя сілы», «Тры ворагі нашай душы», «Тры апошнія рэчы»...

Факсімільнае перавыданне «Буквара» падрыхтавана з захаваннем усіх асаблівасцяў арыгінала (фона паперы, пацёртасцяў і дэфектаў, пазнак на кнізе, першапачатковага памеру). Дзве кнігі: «Буквар языка славенскага» (што з'яўляецца факсімільным) і «Буквар у жыцці нашых продкаў» Алеся Сушы — змяшчаюцца ў адной картоннай абгортцы.

Кіраўнік Апякунскага савета Раман Матульскі на прэзентацыі, прымеркаванай да Года кнігі і Дня ведаў, з гумарам адзначыў, што ў перамогі заўсёды шмат бацькоў, а вось калі нешта не ўдаецца, тады цяжкавата высветліць, чыя гэта была ідэя:

— Ідэя факсімільнага перавыдання помнікаў кніжнай культуры — яна не новая, і мы не аднойчы прэзентавалі свае прапановы, што неабходна вярнуць пэўныя выданні на радзіму. А самае галоўнае — увесці іх у шырокі ўжытак. Бо зразумела, што рэдкую кнігу, якая знаходзіцца ў музеі ў адзіным экзэмпляры, шырокае кола чытачоў не ўбачыць... Хачу падкрэсліць некалькі важных рэчаў. Вучэбная кніга, буквар — тая кніга, з якой мы пачынаем ісці па жыцці, знаёмімся з сусветам. Зараз у сем'ях адно-два дзіцяці, а раней іх лічылі дзясяткамі. Таму гэтая кніжка пераходзіла з рук у рукі. Калі дзеці малыя, яшчэ да школы яны і малявалі ў ім, і крэмзалі, і пісалі, і лізалі — і ў канчатковым выніку дралі на кавалкі. Таму буквары захаваліся ў свеце вельмі-вельмі дрэнна, калі не сказаць ніяк. Гэтым яны адрозніваюцца ад іншых выданняў, якія ўсё ж такі шанавалі.

Віленскага «Буквара» 1767 года ў свеце захавалася толькі два экзэмпляры. З іншымі старажытнымі кнігамі для навучання адбылося прыкладна тое ж: існуюць адзінкавыя экзэмпляры. Для параўнання Раман Матульскі нагадаў:

— Сёння ва ўсім свеце вядома толькі два экзэмпляры Псалтыра Францыска Скарыны, які, зразумела, быў у свой час у першую чаргу падручнікам — абодва знаходзяцца ў Расіі. Адзін асобнік «Азбукі» Фёдарава 1574 года знаходзіцца ў Злучаных Штатах Амерыкі. Толькі два перавыданні Астрожскім гэтай жа «Азбукі» ў 1578 годзе ёсць у Даніі і Германіі. Адзін экзэмпляр «Азбукі» Мамонічаў 1590 года знаходзіцца ў Расіі. Два экзэмпляры першага «Буквара» 1618 года цяпер у Вялікабрытаніі і Даніі.

— Вельмі каштоўна тое, што гэтыя выданні ўвогуле захаваліся, — дадае Матульскі. — Таму было б выдатна, каб іх, нават і ў выглядзе факсіміле, пабачыла як мага больш людзей. Тым больш што гэта не проста носьбіты інфармацыі. Гэта захавальнікі культурнай спадчыны, духу эпохі — метадалогіі падыходу да выхавання і навучання дзяцей.

У кіраўніка кампаніі «XEROX» у Беларусі Аляксандра Швеца свае матывы, каб папулярызаваць кніжную спадчыну. Ён упэўнены, што наша краіна мае шматвекавую асветніцкую традыцыю, багатую гістарычную спадчыну, многія сведчанні якой мы, на жаль, страцілі, аддаўшы суседзям і нават захопнікам. Таму прадставіць Беларусь як краіну славутай гісторыі на падставе каштоўных матэрыяльных сведчанняў ён лічыць справай асабліва важнай:

— Я сам ураджэнец старажытнага Турава. Праблема Беларусі ў тым, што мы жывём у такім своеасаблівым сусветным калідоры з Захаду на Усход, праходзячы па якім усе любілі рабаваць, захопліваць, спальваць. Гэта можна назіраць і на прыкладзе гістарычных археалагічных каштоўнасцяў, якія былі знойдзены на Тураўшчыне выбітнымі навукоўцамі-археолагамі. Нашы набыткі прэзентавалі, вывозілі з Мінска ў Маскву. І тыя ж захопнікі шмат чаго забіралі і вывозілі. А на самой Тураўскай зямлі захаваўся фактычна толькі фундамент царквы XI стагоддзя, які накрылі сучасным купалам, укачаўшы ў замкавую гару сотні кубаметраў бетону... Таму наша бяда заключаецца ў тым, што і месца размяшчэння, і гістарычная перспектыва склаліся так, што саміх помнікаў гісторыі і культуры захавалася няшмат, нягледзячы на вялікую гістарычную значнасць Беларусі ў еўрапейскім і сусветным гістарычным працэсе.

Швец упэўнены, што тая ж праблема датычыцца і кніг. Таму, вырашаючы яе, звярнуліся да самага пачатку — да «Буквара». Кіраўнік «XEROX» абгрунтаваў і тое, чаму выдадзена другая кніга з перакладам і каментарыямі:

— Зноў вяртаюся да дзяцінства. У маёй бабулі было «Жыціе Святых», я яго часам гартаў. І мяне раздражняла, што я не магу зразумець усяго, што ў ёй напісана... Таму наша ідэя: зрабіць «Буквар» двухадзіным. З аднаго боку, мы робім факсіміле, што дакладна адпавядае арыгінальнай кнізе. З другога, яна толькі тады будзе адыгрываць сваю культурна-асветніцкую ролю, калі нашы дзеці і мы без перакладчыка зможам разумець тую мову. І нам гэта будзе падставай яшчэ раз задумацца над сучаснай адукацыяй, над тым, наколькі плённую глебу яна стварае для нашых дзяцей. Адсюль і з'явілася другая кніга — гэта фактычна пераклад на рускую мову з навуковымі каментарыямі. Я лічу, што і першая, і другая кнігі надзвычай важныя, але найбольш каштоўныя яны разам.

Віленскі «Буквар» будзе адпраўлены ў бібліятэкі ўсіх рэгіёнаў Беларусі, каб ім сапраўды маглі карыстацца. Яго ж будуць уручаць пераможцам гуманітарных алімпіяд і, натуральна, пераможцам бібліятэчных конкурсаў, каб кніга набыла шырокі ўжытак.

Апякунскі савет Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, як адзначае Швец, бачыць два шляхі папулярызацыі і вяртання нашай кніжнай спадчыны. Па-першае, гэта збор кніг па ўсім свеце, на аўкцыёнах. Гэта асноўная праца, яна абмяркоўваецца з кіраўніцтвам бібліятэкі. У параўнанні з Беларуссю, напрыклад, у Расіі знаходзяцца гіганцкія кніжныя фонды. Але нам іх вярнуць адзіным крокам немагчыма. Іх трэба вяртаць цярпліва, паступова. І гэта праца ўсіх: і дыпламатаў, і бізнэсу, і гісторыкаў, і навукоўцаў — гэта наш агульны клопат. Па-другое, гэта не толькі стварэнне факсімільных выданняў, але і іх папулярызацыя — рабіць іх сацыяльна карыснымі праектамі.

— Я лічу, што беларусы па сваёй ментальнасці вельмі дамавітыя, яны моцна паважаюць сваю культуру, — дадаў Швец. Таму я ўпэўнены, што гэты кірунак па зборы нашых кніжных помнікаў і яго папулярызацыі будзе мець плённае развіццё.

Відавочна, вяртанне нашай кніжнай спадчыны патроху набірае абароты. Выданне факсімільнага Віленскага «Буквара», ды яшчэ і з каментарыямі і перакладамі, — значная падзея. Варта прыгадаць і нядаўняе вяртанне на Беларусь Трэцяга Статута ВКЛ, якое арганізаваў студэнт Андрэй Радкоў. Зараз ён жа вядзе збор сродкаў на набыццё «Вялікага мастацтва артылерыі» Казіміра Семяновіча 1651 года. Калі і студэнту, і бізнэсменам удаецца вяртаць ці аднаўляць нашы спрадвечныя каштоўнасці — значыць, не ўсё яшчэ страчана.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

# ...Сябры шлюць пасланне светлай Беларусі

**У межах святкавання Дня беларускага пісьменства сёння ў Глыбокім працуе Міжнародны «круглы стол» «Пісьменнік. Кніга. Час».**

Сярод удзельнікаў дыскусіі па актуальных пытаннях развіцця мастацкай літаратуры ў свеце, уплыву кнігі на свядомасць чалавека побач з беларускімі літаратарамі — паэты, празаікі, драматургі, публіцысты з Расіі, Сербіі, Чарнагорыі, Таджыкістана, Азербайджана, Казахстана. «Круглы стол», які па традыцыі ініцыіраваны Міністэрствам інфармацыі краіны, Саюзам пісьменнікаў Беларусі, рэдакцыйна-выдавецкай установай «Літаратура і Мастацтва», выдавецтвам «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі», сёлета стане пляцоўкай для абмеркавання самых розных творчых і грамадскіх праблем. Сваімі поглядамі на жыццё і мастацкі свет падзеляцца намеснік галоўнага рэдактара «Роман-газеты» Юрый Казлоў (Масква), празаік Ліліяна Хаб'янавіч-Джуравіч (Сербія), паэт, драматург Слабадан Вуканавіч (Чарнагорыя) намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Наш современник» Аляксандр Казінцаў (Масква), гісторык кніжнай культуры, прысутнасці беларусаў у Сібіры Антаніна Шынкарова (Іркуцк), выдавец, празаік Ато Хамдам (Таджыкістан), старшыня Федэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі «Беларусы Расіі», празаік Валерый Казакоў (Масква), паэт Чынгіз Алі аглы (Азербайджан), празаік Генадзь Даронін ( Казахстан), беларускія пісьменнікі Раіса Баравікова, Таццяна Сівец, Мікола Мятліцкі, Юлія Зарэцкая, Алесь Бадак і іншыя.

У пярэдадзень «круглага стала» мы запыталіся ў замежных гасцей, з якім настроем яны прыязджаюць у Беларусь. І вось што пачулі ў адказ:

**Чынгіз Алі аглы:**

— Мне часта даводзіцца бываць у Мінску. Наколькі я магу меркаваць, няблага ведаю беларускую літаратуру. З задавальненнем перачытваю творы Васіля Быкава і Івана Шамякіна. З прыемнасцю адзначаю памкненні народа Беларусі да пабудовы сацыяльна справядлівай дзяржавы. Мне асабіста імпануе тое, што беларусы вельмі асцярожна, па кроках, з асэнсаваннем штодзённай рэчаіснасці, ідуць у рынак. Ставяцца да прыватнай уласнасці і з улікам палітычнага і сацыяльнага вопыту ранейшага часу.

**Слабадан Вуканавіч:**

— Я ў захапленні ад Мінска. Бываючы ў вашай сталіцы, кожны раз іду да Нацыянальнай бібліятэкі... Пра гэтыя сустрэчы з бібліятэкай як храмам ведаў і славянскай краінай як храмам праведнасці — мой верш «Нацыянальная бібліятэка ў Мінску»: «Шкляны Вавілонскі каўчэг прыбывае і адбывае/ Падарожнічае, але не знікае/ Цуд, што немагчыма яго дагнаць/ А тым больш апярэдзіць/ Ён захоўвае памяць і душы нашы/ Забяспечвае працяг існавання/ Шчаслівы той, хто каўчэг Вавілонскі мае». Пераклаў гэтыя радкі на беларускую мову мой сябра Іван Чарота. Імі і шлю пасланне светлай Беларусі!..

**Антаніна Шынкарова:**

— Па роду сваіх гістарычных вышукаў я бачу многія кропкі судакранання народаў Расіі і Беларусі. І вельмі ганаруся, што ў расіян ёсць такія сябры, браты, як беларусы. Народ Беларусі і сёння — маральная, духоўная апора народа Расіі. Разам мы здольныя захаваць развіццё свету ў рэчышчы гуманізму, дабра і справядлівасці.

**Кастусь ЛАДУЦЬКА.**

# ПА ВЕДЫ!



# Трохмесячныя школьныя канікулы — галаўны боль для бацькоў?

**Павелічэнне працягласці навучальнага года і колькасці гадзін, якія адводзяцца ў школьнай праграме на вывучэнне фізікі і матэматыкі, — пытанне не сённяшняга дня, а «заданне на заўтра», расказаў журналістам намеснік міністра адукацыі Васіль БУДКЕВІЧ:**

— У навучальным годзе, які стартуе 1 верасня, вучэбныя планы пераглядацца не будуць, як не будзе пераглядацца і працягласць школьных канікул. Але ні Кодэкс аб адукацыі, ні іншыя дакументы — гэта не догма. Сістэма адукацыі павінна адпавядаць патрэбам грамадства і той сітуацыі, якая рэальна складваецца ў сектары эканомікі, — падкрэсліў Васіль Будкевіч. — А ў нас сёння назіраецца яўны ўхіл у гуманітарны бок. Пры гэтым мы цудоўна разумеем, што без авалодання фізікай і матэматыкай падрыхтаваць у дастатковай колькасці інжынерна-тэхналагічныя кадры для рэальнага сектара эканомікі немагчыма. Таму мы вымушаны думаць пра будучыню. Ці дапаможа з'яўленне ў школьным раскладзе дадатковых гадзін на вывучэнне фізікі і матэматыкі выправіць сітуацыю? Будзем думаць, раіцца з педагагічнай грамадскасцю. А што тычыцца скарачэння працягласці канікул, то мяркуем, што калі навучальны год падоўжыцца на тыдзень-другі, то ніхто ад гэтага не пацерпіць. Трохмесячныя летнія канікулы засталіся нам у спадчыну з савецкіх часоў. Але гэта быў зусім іншы час, калі і бацька мог узяць пуцёўку дзіцяці ў аздараўленчы лагер, і маці. У многіх у вёсках заставаліся жыць бацькі, таму дзеці ўвесь час летняга адпачынку знаходзіліся пад наглядам дарослых. А на сённяшні дзень трохмесячныя канікулы пераўтварыліся ў галаўны боль не толькі для нас, педагогаў, для органаў аховы правапарадку, але і для бацькоў. Менавіта летні час застаецца самым небяспечным для нашых дзяцей. З іншага боку, першую палову чэрвеня абсалютная большасць педагогаў усё роўна знаходзяцца на сваіх працоўных месцах, таму праблем з арганізацыяй навучальнага працэсу мы не бачым. Але хачу падкрэсліць: перш чым прыняць тое ці іншае рашэнне аб скарачэнні працягласці школьных канікул, мы будзем раіцца і з бацькоўскай грамадскасцю, і з Міністэрствам аховы здароўя. Будзем вывучаць і сусветны досвед у гэтым пытанні.

На сённяшні дзень колькасць гадзін, якая адводзіцца на вывучэнне фізікі ў беларускіх школах, складае па фізіцы ў VI класе 1 гадзіну на тыдзень, а VII-XI класах — 2 гадзіны. Па матэматыцы ў V—VI класах — 5 гадзін на тыдзень і ў VII—IX класах — 4 гадзіны.

Васіль Будкевіч расказаў, што ў новым навучальным годзе ў вучэбныя аўдыторыі прыйдуць амаль 2 мільёны чалавек, у тым ліку 900 тысяч вучняў школ. Першыя класы школ прымуць больш як 91 тысячу чалавек — на 3 тысячы больш, чым летась. А вось сетка агульнаадукацыйных устаноў працягвае скарачацца. Так, да пачатку 2012/2013 года ў краіне былі зачынены і рэарганізаваны 202 установы адукацыі. Да месца вучобы ў новым навучальным годзе давядзецца падвозіць больш як 75 тысяч дзяцей.

Але ў Беларусі працягваюць будавацца і новыя школы. 1 верасня свае дзверы расчыняць шэсць новых агульнаадукацыйных устаноў. 1 верасня ва ўсіх беларускіх школах пройдзе Дзень ведаў: урачыстыя лінейкі, экскурсійныя мерапрыемствы, сустрэчы з цікавымі людзьмі...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ■ Расклад на заўтра

# «ЦТ — АДМЯНІЦЬ, А ШКОЛЬНЫЯ ЎРОКІ ПА СУБОТАХ — АДНАВІЦЬ»

## ...З ТАКІМІ ПРАПАНОВАМІ ВЫСТУПІЛІ ПЕРАД ЖУРНАЛІСТАМІ ПАРЛАМЕНТАРЫІ

**Чаго ў гімназічнай адукацыі больш — плюсоў ці мінусаў? Ці трэба браць на старэйшую ступень школы ўсіх ахвотных? Ці можна спадзявацца, што пры ўмове павелічэння ў школьнай праграме колькасці гадзін на вывучэнне фізікі і матэматыкі падрыхтоўка выпускнікоў па гэтых дысцыплінах істотна палепшыцца? Наколькі апраўдала сябе школьная пяцідзёнка? Сваім бачаннем гэтых і многіх іншых праблем падзяліліся з журналістамі старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Анатоль ГЛАЗ і старшыня Пастаяннай парламенцкай камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе Уладзімір ЗДАНОВІЧ.**

Анатоль Глаз упэўнены, што мода на гімназічную адукацыю сёння нічым не апраўдана:

— «Як гэта не мець у раёне ці горадзе гімназію або агульнаадукацыйны ліцэй?» — прыблізна так разважае большасць мясцовых кіраўнікоў. Між іншым, розніца ў фінансаванні гімназій і агульнаадукацыйных школ — вельмі істотная: на аднаго гімназіста выдаткоўваецца на 35% сродкаў больш, чым на вучня звычайнай школы. Пры гэтым гімназісты далёка не заўсёды дэманструюць тыя вынікі, якія ад іх чакаюць, узяць хоць бы іх удзел у алімпіядах па школьных дысцыплінах... Фактычна мы ідзём шляхам рэзкага расслаення: ёсць элітныя навучальныя ўстановы і звычайныя школы. Усе лепшыя вучні і лепшыя педагогі пайшлі ў гімназіі і ліцэі, таму вучням агульнаадукацыйных школ сёння няма на каго раўняцца, а маладым педагогам няма ў каго вучыцца...

— Праблема карупцыі апошнім часам стала пакрысе змяшчацца ў бок гімназій, таму што ўсе бацькі спрабуюць уладкаваць сваё дзіця менавіта ў навучальную ўстанову новага тыпу, — канстатаваў Уладзімір Здановіч. — У грамадстве ёсць трывалая думка, што толькі ў гімназіі дзіця атрымае самыя лепшыя веды. А да звычайных школ стаўленне ў бацькоў, наадварот, вельмі скептычнае. Хоць у рэчаіснасці ўсё залежыць не ад шыльды на ўстанове адукацыі, а ад якаснага складу педагагічнага калектыву. З іншага боку, сёння ў гімназіі ўсё часцей трапляюць дзеці з сярэднімі здольнасцямі, з адсутнасцю матывацыі да вучобы, таму і чаканых вынікаў на выхадзе няма. Тэарэтычна, калі ўжо ствараць для ўсіх дзяцей аднолькавыя стартавыя магчымасці для атрымання адукацыі, то ад навучальных устаноў новага тыпу трэба было б адмаўляцца. Усё роўна яны не могуць быць даступныя для ўсіх, асабліва, калі таленавіты школьнік жыве ў сельскай мясцовасці, а гімназія знаходзіцца, напрыклад, у раённым цэнтры — за 15-20 кіламетраў. Але як у такім разе ўлічыць інтарэсы і патрэбы, скажам, 10-15 адораных дзяцей? Калі такія дзеці ёсць, і ёсць педагогі, гатовыя з імі працаваць, то можна было б ствараць у школах гімназічныя класы. Мяркую, што адкрыўшы паўсюдна па краіне гімназіі, мы нічога не набылі, затое страцілі з той школы, што была ў нас раней, штосьці каштоўнае.

Анатоль Глаз лічыць, што пры пераходзе ў 10-ы клас трэба ўводзіць парог паспяховасці, паколькі 18% выпускнікоў 11-х класаў усё роўна ідуць навучацца ў прафесійна-тэхнічныя навучальныя ўстановы. Навошта для засваення многіх рабочых прафесій наяўнасць агульнай сярэдняй адукацыі? І чаму, напрыклад, у Германіі для таго, каб падрыхтаваць рабочага па ўкладцы тратуарнай пліткі, хапае ўсяго два тыдні, а мы рыхтуем плітачнікаў ад 10 месяцаў да 2 гадоў? Крытэрыем адбору прэтэндэнтаў на навучанне на старшай ступені школы маглі б стаць, скажам, вынікі выпускных экзаменаў за курс базавай школы...

Увогуле, сістэму кантролю за паспяховасцю навучэнцаў, на думку, Анатоля Глаза, трэба рэфармаваць: «Цэнтралізаванае тэсціраванне ўжо адыграла сваю ролю. Яно было патрэбным, карысным, але мы павінны ўжо шукаць іншыя шляхі. Да таго ж — няўжо наша дзяржава настолькі заможная, што мы можам сабе дазволіць двойчы правяраць сістэму ацэнкі падрыхтоўкі навучэнцаў?»

Анатоль Глаз падкрэсліў, што ў многіх краінах Еўропы існуюць зусім іншыя сістэмы ацэньвання і кантролю, і там школьны атэстат з'яўляецца адзіным дакументам, па якім ажыццяўляецца адбор у ВНУ. Гэтыя сістэмы менш траўматычныя для дзяцей у псіхалагічным плане і менш фінансава затратныя для дзяржавы. Парламентарый патлумачыў, што можна было б цэнтралізавана рассылаць па школах заданні пасля выстаўлення адзнак за чвэрць: калі па выніках кантрольнага зрэзу адзнака ў вучня будзе плюс-мінус адзін бал у параўнанні з адзнакай за чвэрць (па 10-бальнай шкале), то пытанняў ніякіх не будзе, але калі плюс-мінус два балы, то настаўніку давядзецца адказваць, чаму ён завысіў ці занізіў вучню ацэнку. А ў атэстат пойдзе сярэдняя адзнака, якая будзе складацца з выстаўленай настаўнікам адзнакі за чвэрць і атрыманай падчас кантрольнага зрэзу. На думку дэпутата, такое пастаяннае тэсціраванне ведаў дапаможа больш глыбока ацэньваць веды школьніка ў адрозненне ад разавага цэнтралізаванага тэсціравання, якое спрабуе ахапіць усю праграму 11-гадовай школы і пакідае абітурыентам магчымасць звычайнага ўгадвання адказаў. «Я прапаную не канкрэтны рэцэпт, а прынцып», — дадаў Анатоль Глаз.

А вось да ініцыятывы Міністэрства адукацыі падоўжыць навучальны год за кошт скарачэння школьных канікул дэпутаты ставяцца вельмі адмоўна:

— Працягласць навучальнага года — з 1 верасня да 31 мая — занатаваная ў Кодэксе аб адукацыі. Ніхто не мае права яго парушаць. І нават калі хтосьці паспрабуе гэта зрабіць, то яго чакае вельмі працяглая працэдура, — папярэдзіў Уладзімір Здановіч. — Пры рабоце над Кодэксам замахі на школьныя канікулы ўжо рабіліся — былі ахвотныя падоўжыць школьныя заняткі і ў чэрвені. Але нам удалося летнія канікулы адстаяць: пры скарачэнні летніх канікул скарачаюцца магчымасці для аздараўлення дзяцей у летніках, скарачаецца і час на падрыхтоўку школ да новага навучальнага года, на іх рамонт, рэканструкцыю і гэтак далей. Да таго ж я, як настаўнік, скажу шчыра, што як толькі вясновае сонейка зазірае ў акно, пра вучобу можна пацяху забываць, таму што дзеці мараць толькі аб адным — як бы хутчэй вырвацца са школы.

Затое павелічэнне колькасці ўрокаў фізікі і матэматыкі, на думку старшыні парламенцкай камісіі, магло б выправіць сітуацыю з татальнай матэматычнай неадукаванасцю.

— У савецкай школе ўзровень падрыхтоўкі па матэматычных і прыродазнаўча-навуковых дысцыплінах быў вельмі высокі. І Злучаныя Штаты Амерыкі Савецкі Саюз даганялі. Але давайце прыгадаем: у савецкай школе ўрокі матэматыкі былі штодня. Рэгулярны працэс падрыхтоўкі мае выключна важнае значэнне. А самыя няшчасныя школьныя прадметы — тыя, для якіх у школьным раскладзе была адведзена ўсяго адна гадзіна на тыдзень. Праўда, значэнне мае і тое, як будуць дабаўляцца гэтыя гадзіны, — падкрэсліў Уладзімір Здановіч. — Калі за кошт падаўжэння навучальнага года, то, мяркую, што нават у педагагічнай грамадскасці такі крок энтузіязму не выкліча. Я б параіў больш шчыльна прыгледзецца да вольнай ад урокаў школьнай суботы. Пры пераходзе на пяцідзёнку ставілася некалькі мэтаў: каб дзеці больш часу праводзілі з бацькамі, займаліся спортам, каб у школьнікаў палепшылася здароўе. Але ні першай, ні другой мэты мы не дасягнулі. З 11-х класаў выходзіць толькі 8% цалкам здаровых дзяцей. Калі я ў суботу праехаўся па сельскіх школах, то нідзе не заўважыў дзяцей. На мае пытанне мне паўсюдна адказвалі: «Дзеці былі, але ўжо сышлі». І ў чым у такім разе сэнс шостага школьнага дня? Дык давайце зробім суботу скарочаным днём — няхай у гэты дзень там праводзяцца па тры-чатыры ўрокі...

Анатоль Глаз, у сваю чаргу, упэўнены, што ў школьную праграму трэба абавязкова вярнуць трэцюю гадзіну фізічнай культуры: «На маю думку, трэці ўрок фізічнай культуры больш важны, чым трэці ўрок замежнай мовы, бо хто пажадае засвоіць замежную мову, той знойдзе спосаб і час, каб гэта зрабіць, а вось здароўе ўжо ніколі не вернеш...»

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■ Лета-2012

# ЁСЦЬ ЖАДАННЕ — БУДЗЕ І ВЫНІК

## У некаторых студэнцкіх атрадах сёлета зараблялі па 7 мільёнаў рублёў

**Лепшыя прадстаўнікі студатрадаўскага руху з усіх рэгіёнаў Беларусі сабраліся ў Гродне на рэспубліканскі злёт «Лета-2012».**

У наступным годзе студатрадаўскі рух нашай краіны адзначыць свой паўвекавы юбілей — столькі гадоў мінула з дня адпраўкі ў Казахстан першага беларускага атрада, які ўдзельнічаў у асваенні цалінных земляў. І сёлета дзелавая рэпутацыя студэнцкіх атрадаў яшчэ больш умацавалася. Яны працавалі на рэканструкцыі і будаўніцтве дарог, малочнатаварных фермаў, жылых дамоў, храмаў. Сярод значных аб'ектаў — новы будынак музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў Мінску, комплекс «Студэнцкая вёска», бальніцы ў Віцебску і Наваполацку, Лядовы палац у Оршы, новая цэментная лінія ў ААТ «Краснасельскбудматэрыялы», падрыхтоўка горада Горкі да рэспубліканскіх «Дажынак»... У складзе 1382 студэнцкіх атрадаў адпрацавалі альбо працягваюць працу 29463 чалавекі, 9928 — працаўладкаваны індывідуальна, 18028 юнакоў і дзяўчат узялі на сябе абавязкі валанцёраў.

— Указ кіраўніка дзяржавы «Аб арганізацыі дзейнасці студэнцкіх атрадаў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь», які ўступіў у сілу 16 красавіка гэтага года, значна пашырыў магчымасці для працаўладкавання моладзі, — адзначае другі сакратар ЦК грамадскага аб'яднання «БРСМ» Альбіна Сычэўская. — І той, хто жадаў працаваць, даволі някепска папоўніў уласны бюджэт: месячная зарплата ў сярэднім складала 3-4 мільёны рублёў, а ў некаторых студатрадаўцаў перавысіла 7 мільёнаў.

Гэта пацвердзіў і адзін з наймальнікаў, кіраўнік лагістычнага цэнтра Васіль Швед, адзначыўшы, разам з тым, што далёка не ва ўсіх студэнтаў хапала жадання так працаваць і, адпаведна, атрымліваць добрую зарплату.

Дарэчы, Гродзеншчына займае асаблівае месца ў гісторыі сучаснага студатрадаўскага руху: у 2005 годзе ўказам кіраўніка дзяржавы рэканструкцыя Аўгустоўскага канала была аб'яўлена першай моладзевай будоўляй суверэннай Беларусі. Цяпер жа, менавіта да рэспубліканскага злёту студэнцкіх атрадаў, у горадзе над Нёманам прымеркавалі адкрыццё першага ў краіне шматпрофільнага моладзевага цэнтра. Гэты праект быў рэалізаваны якраз дзякуючы ідэям і працы моладзі (у тым ліку гродзенскіх студэнтаў, а таксама дызайнераў інстытута «Гроднаграмадзянпраект», якія ўпрыгожылі інтэр'ер выявамі старога горада з яго архітэктурнымі славутасцямі) пры фінансавай падтрымцы абласной інавацыйнай праграмы. Створаны выдатныя ўмовы не толькі для адпачынку, але і для рэалізацыі творчага патэнцыялу моладзі, бізнэс-ідэй. А таксама для працаўладкавання студэнтаў і нават бясплатнага навучання пенсіянераў камп'ютарным «азам».

Старшыня Гродзенскага аблвыканкама Сямён Шапіра паведаміў, што ў наступным годзе ў абласным цэнтры будзе пабудаваны яшчэ адзін, значна большы па плошчы, моладзевы цэнтр. Акрамя таго, пад такія цэнтры будуць пераабсталяваны кінатэатры, якія аказаліся незапатрабаванымі ў райцэнтрах.

— Мы гатовы падзяліцца сваім досведам з усімі, каб ім скарысталіся і ў іншых рэгіёнах краіны, — прапануе першы сакратар Гродзенскага абласнога камітэта БРСМ Юрый Аляксей.

Пасля прэзентацыі моладзевага цэнтра «Гродна» тут адбылася «Адкрытая трыбуна»: на пытанні студэнтаў адказалі прадстаўнікі органаў дзяржаўнага кіравання. У прыватнасці, некаторыя праблемныя пытанні (працаўладкаванне непаўналетніх, навучанне будатрадаў перад трэцім працоўным семестрам і інш.) міністр адукацыі Беларусі Сяргей Маскевіч паабяцаў узяць на заметку і абмеркаваць з адпаведнымі дзяржаўнымі структурамі.

**Барыс ПРАКОПЧЫК**

# Рэкордная запазычанасць: з-за яе могуць і выселіць

**Сталічны кватэраздымшчык завінаваціў па камунальных плацяжах рэкордную суму — больш як 58 млн рублёў.**

Як паведаміў карэспандэнту агенцтва «Мінск—Навіны» начальнік РДЦ № 1 ЖРЭА Цэнтральнага раёна Аляксей Сальнік, злосны неплацельшчык пражывае фактычна адзін у дзяржаўнай аднапакаёвай кватэры на вуліцы Чарвякова, прычым з усімі камунальнымі выгодамі. Адключыць электраэнергію і ваду, як гэта практыкуюць камунальнікі ўжо пасля 2 месяцаў запазычанасці, не дазваляе тая акалічнасць, што ў кватэры, акрамя галоўнага наймальніка, зарэгістраваны яшчэ 6 чалавек, уключаючы непаўналетніх. Аднак яны пражываюць па іншых адрасах.

— Даўжнік нідзе не працуе, любіць выпіць, — удакладніў Аляксей Сальнік. — Нашы прапановы ўладкавацца на працу ў ЖЭС і пачаць гасіць запазычанасць ігнаруе. Верагодна, эксплуатуе той факт, што прымяніць жорсткія механізмы ўздзеяння аж да перасялення ў пакой у кватэры з агульнай кухняй не ўяўляецца магчымым: разам з ім прапісаны непаўналетнія.

Характэрна, што асноўны доўг складае 15 млн 425,5 тыс. рублёў. Астатнія — пеня.

**Аляксандр ФІЛІПОВІЧ,**
*«Мінск—Навіны».*

### ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ ЗАСТРОЙЩИКА от 15.11.2010 г.

**Сведения о застройщике**:
Белорусско-английское Совместное закрытое акционерное общество «ЛадаГарант» (СЗАО «ЛадаГарант»). СЗАО «ЛадаГарант» является универсальным правопреемником СП «Лада ОМС – Холдинг» ЗАО).

**Местонахождение:** г. Минск, ул. Грушевская, 91, пом. 4Н.

**Режим работы**: рабочие дни – с понедельника по пятницу, рабочие часы – с 8 ч. 30 мин. до 17 ч. 30 мин., обед – с 13 ч. 00 мин. – до 14 ч. 00 мин., выходные дни – суббота, воскресенье.

**Данные о государственной регистрации**: зарегистрировано Министерством иностранных дел Республики Беларусь в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100934617.

**Сведения о проектах жилых домов**, введенных в эксплуатацию за последние 5 лет:
1. 9- этажный 5-секционный 175-квартирный жилой дом № 91 по ул. Грушевская в г. Минске;
2. 15-17-этажный односекционный 82-квартирный жилой дом № 15 по ул. Маяковского в г. Минске со встроенно-пристроенными помещениями подземного гаража-стоянки, магазина и аптеки;
3. 7-этажный 5-секционный 135-квартирный жилой дом № 3 по ул. Щорса;
4. 15-этажный односекционный 89-квартирный жилой дом № 8 по ул. Щорса 3-я;
5. 9-этажный 4-х секционный 135-квартирный жилой дом № 1 по ул. Щорса;
6. 10-этажный 7-секционный 261-квартирный жилой дом № 44 по ул. Железнодорожная.

**Цель проекта** – строительство объекта «Многоэтажный жилом дом, не повышенной комфортности, с объектами соцкультбыта и многоуровневая стоянка для автомобилей со встроенно-пристроенными помещениями автоцентра в квартале застройки в границах пр. Дзержинского – пр. Жукова – ул. Железнодорожная – ул. Щорса в городе Минске. 1-й этап (1-ый пусковой комплекс)».

с привлечением денежных средств граждан и юридических лиц, путем заключения договоров создания объектов долевого строительства.

**Сведения о сроках реализации**
Начало строительства – второе полугодие 2010 г.
Ввод объекта в эксплуатацию – второе полугодие 2012 г.

**У Застройщика имеются:**
- решения Мингорисполкома о разрешении на строительство № 2565 от 30.10.2008 г.;
- проектно-сметная документация, прошедшая в установленном порядке государственную экспертизу в РУП «Белгосэкспертиза Минстройархитектуры» (заключения от 04.12.2007 г. № 2685-5/07, от 14.01.2008 г. № 113-5/08, от 04.08.2010 № 859-15/10), государственную экологическую экспертизу (заключение № 239 от 30.08.2007 г., № 72 от 20.07.2010 г.);
- разрешение на производство строительно-монтажных работ от 10 ноября 2010 г. № 2-203Ж-005/10(1).

**Местонахождение строящегося объекта**: г. Минск, пересечение пр.Дзержинского – пр.Жукова, в квартале застройки в границах пр. Дзержинского – пр. Жукова – ул. Железнодорожная – ул. Щорса.

**Количество предлагаемых для заключения договоров создания объектов долевого строительства:**
**По жилому дому:**
1-комнатные – 1 шт.,
2-комнатные – 8 шт.,
3-комнатные – 8 шт.;

**Цена одного квадратного метра в 1-комнатных квартирах** общей площади жилых помещений (без отделки) составляет – **10 200 000** белорусских рублей (для лиц не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий).

**Цена одного квадратного метра в 2-комнатных квартирах** общей площади жилых помещений (без отделки) составляет – **9 700 000** белорусских рублей (для лиц не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий).

**Цена одного квадратного метра в 3-комнатных квартирах** общей площади жилых помещений (без отделки) составляет – **9 200 000** белорусских рублей (для лиц не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий).

**Данные о правах Застройщика на земельный участок:** земельный участок предоставлен Застройщику решением Мингорисполкома от 30.10.2008 г. № 2565 площадью 3,7474 га.

**Элементы благоустройства:** создаются площадки для отдыха, занятия спортом, детская площадка, газоны, озеленение; покрытие проездов к дому – двухслойный асфальтобетон, тротуаров – мелкоразмерная плитка, дорожек и площадок – спецсмесь и плитка.

**Общее имущество дольщиков –** межквартирные лестничные клетки, лестницы, коридоры, крыша, техподполье, несущие, ограждающие конструкции, оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и нежилых помещений, элементы благоустройства и озеленения.

**Предполагаемый срок ввода дома в эксплуатацию (1-го пускового комплекса)** – 2-е полугодие 2012 г.

**Сведения о договорах строительного подряда:**
Договор подряда с ЗАО «Инсервисстрой» № 2-09 от 28.12.2009 г.

**Условия ознакомления с информацией по проекту:**
по тел. 8-017 219-78-22, VELCOM 8-029 679-34-24; на сайте **http://www.lada.by/** либо по адресу: ул. Грушевская, 91, пом. 4Н, каб. 5.

01.09.2012 г.

**Застройщик**
**СЗАО «ЛадаГарант»** **Ваганов А.В.**

# СТУДЭНЦКІЯ ІНТЭРНАТЫ — НЕ МЕСЦА ДЛЯ КУРЭННЯ

**Адміністрацыя Партызанскага раёна сталіцы абвясціла з 1 верасня інтэрнаты ўстаноў адукацыі, якія размешчаны на яго тэрыторыі, зонамі, свабоднымі ад курэння.**

Пры прыняцці гэтага рашэння раённыя ўлады кіраваліся некалькімі складнікамі. Сярод галоўных аргументаў — папулярызацыя здаровага ладу жыцця, захаванне правоў грамадзян на спрыяльнае асяроддзе пражывання і папярэджанне нанясення шкоды іх жыццю і здароўю, паляпшэнне дэмаграфічнай бяспекі, неабходнасць падтрымання належнага санітарнага стану інтэрнатаў.

У сувязі з прынятым рашэннем кіраўнікам інтэрнатаў устаноў адукацыі неабходна забяспечыць размяшчэнне адпаведных інфармацыйных знакаў, давесці да ведама навучэнцаў інфармацыю пра забарону курэння і пазнаёміць іх з прадугледжанымі заканадаўствам мерамі адказнасці за курэнне ў забароненых месцах.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Вниманию акционеров ОАО «Белгорхимпром»!*

**ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**

## ОАО «БЕЛГОРХИМПРОМ»

**СОСТОИТСЯ 17 сентября 2012 года в 11.00**
**по адресу: г. Минск, пр. Машерова, 17, в актовом зале.**

**Повестка дня:**
1. Избрание нового состава наблюдательного совета и ревизионной комиссии ОАО «Белгорхимпром».

Регистрация акционеров в день проведения собрания с 9.00 до 10.30 по адресу: г. Минск, пр. Машерова, 17, в актовом зале (3 этаж).

УНН 600024712

### ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества** | **Лот № 1.** Здание одноквартирного жилого дома площадью 78,7 кв.м, инв. №210/С-2568 |
| **Собственник (владелец) имущества** | ЧТУП «РОМАНстарт» г. Браслав, ул. Ленинская, 76/1 |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | Браславский район, д. Тетерки |
| **Стоимость имущества** | **Лот № 1 –** 21 693 120 рублей |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | г. Браслав, ул. Красноармейская, 8<br>05 октября 2012 года в 12.00 |
| **Информация об обременениях** | Обременений нет |
| **Справочная информация** | Хозяйственный суд Витебской области<br>210101, г. Витебск, ул. «Правды», д. 32, каб. 304<br>http:// vitebsk.court.by/<br>Судебный исполнитель Железовский Юрий Александрович, тел./факс: (80212) 49 13 41, (8 029) 366 40 11<br>Старший судебный исполнитель Бородулин Алексей Александрович, тел. (80212) 49 13 40 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903002094 в 200 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Витебск, код 635, УНН 300007670, не позднее 04.10.2012.<br>Минимальная величина первого шага – 5% стоимости каждого лота.<br>В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Аукцион состоится 03.10.2012 г. в 10.30 по адресу: 220039, г. Минск, ул. Воронянского, д. 5, к. 3, кабинет № 217.**

**Организатором аукциона является РУП «Белпочта» в лице Минского филиала РУП «Белпочта», находящегося по адресу: г. Минск, ул. Воронянского, д. 5, к. 3.**

НА АУКЦИОНЕ ВЫСТАВЛЯЕТСЯ ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА,

**Лот № 1**. Помещение на 2 этаже площадью 43,3 кв.м, расположенное по адресу: Минская область, г. Молодечно, ул. Притыцкого, 18, в удовлетворительном состоянии, срок аренды – 5 лет, начальная цена продажи – 584 550 рублей, размер задатка – 58 455 рублей, целевое использование – размещение офиса, складского помещения, осуществление торговли, оказание услуг, производственных целей (за исключением вредных производств). Коэффициент от 0,5 до 3 установлен 3.

**Лот № 2.** Помещение на 2 этаже площадью 61,6 кв.м, расположенное по адресу: Минская область, г. Борисов, ул. Труда, 5, в хорошем состоянии, срок аренды – 5 лет, начальная цена продажи – 831 600 рублей, размер задатка – 83 160 рублей, целевое использование – размещение офиса, складского помещения, осуществление торговли, оказание услуг, производственных целей (за исключением вредных производств). Коэффициент от 0,5 до 3 установлен 3.

**Лот № 3.** Помещения на 2 этаже площадью 235,3 (7,0; 221,9; 1,6; 2,2; 1,3; 1,3) кв.м, расположенное по адресу: Минская область, г. Борисов, ул. Труда, 5, в хорошем состоянии, срок аренды – 5 лет, начальная цена продажи – 3 176 550 рублей, размер задатка – 317 655 рублей, целевое использование – размещение офиса, складских помещений, осуществление торговли, оказание услуг, производственных целей (за исключением вредных производств). Коэффициент от 0,5 до 3 установлен 3.

**Лот № 4.** Помещения на 1 этаже площадью 79,2 (39,8; 19,1; 20,3) кв.м, расположенное по адресу: Минская область, г. Молодечно, пер. Черняховского, 18, в удовлетворительном состоянии, срок аренды – 5 лет, начальная цена продажи – 1 069 200 рублей, размер задатка – 106 920 рублей, целевое использование– размещение офиса, складских помещений, осуществление розничной торговли, оказание услуг, организации производства (кроме вредных производств). Коэффициент от 0,5 до 3 установлен 1,5.

**Лот № 5.** Помещение на 1 этаже площадью 38,3 кв.м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Стебенева Ф.А., д.10, в хорошем состоянии, срок аренды – 5 лет, начальная цена 517 050 рублей, размер задатка – 51 705 рублей, целевое использование – размещение офисов, складских помещений, осуществления торговли, оказания услуг, организации производства (кроме вредных производств). Коэффициент от 0,5 до 3 установлен 3.

**Лот № 6.** Помещения на 2 этаже площадью 22,6 (17,0; 5,6) кв.м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Стебенева Ф.А., д.10, в хорошем состоянии, срок аренды – 5 лет, начальная цена 305 100 рублей, размер задатка – 30 510 рублей, целевое использование – размещение офисов, складских помещений, осуществления торговли, оказания услуг, организации производства (кроме вредных производств). Коэффициент от 0,5 до 3 установлен 3.

**Лот № 7.** Помещение на 2 этаже площадью 28,6 кв.м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Стебенева Ф.А., д. 10, в хорошем состоянии, срок аренды – 5 лет, начальная цена 386 100 рублей, размер задатка – 38 610 рублей, целевое использование – размещение офисов, складских помещений, осуществления торговли, оказания услуг, организации производства (кроме вредных производств). Коэффициент от 0,5 до 3 установлен 3.

**Лот № 8.** Помещение на 2 этаже площадью 35,9 кв.м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Стебенева Ф.А., д. 10, в хорошем состоянии, срок аренды – 5 лет, начальная цена 484 650 рублей, размер задатка – 48 465 рублей, целевое использование – размещение офисов, складских помещений, осуществления торговли, оказания услуг, организации производства (кроме вредных производств). Коэффициент от 0,5 до 3 установлен 3.

**Лот № 9.** Помещение на 1 этаже площадью 280,6 кв.м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Стебенева Ф.А., д. 10, в хорошем состоянии, срок аренды – 5 лет, начальная цена 3 788 100 рублей, размер задатка – 378 810 рублей, целевое использование – размещение складских помещений, осуществления торговли, оказания услуг, организации производства (кроме вредных производств). Коэффициент от 0,5 до 3 установлен 3.

**Документы на участие в аукционе принимаются с 03.09.12 г. по 28.09.12 г. в рабочее время (с 10.00 до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. Воронянского, д. 5, к. 3, кабинет 103. Документы, поданные после 16.00 28.09.12 г. не рассматриваются.**

Порядок оформления участия в аукционе, а также порядок проведения аукциона определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров от 08.08.2009 г. № 1049.

Для участия в аукционе участник в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе:
- перечисляет задаток на субсчет 3012205780018 в Минском отделении БелАПБ, код 942, УНП 101120215, Минский филиал РУП «Белпочта»;
- подает заявление на участие в аукционе;
- заключает соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;
- предоставляет копию платежного документа о перечислении задатка.

Помимо указанных документов:
- физическое лицо предъявляет документ, удостоверяющий личность;
- индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о государственной регистрации;
- юридическое лицо (резидент Республики Беларусь) – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; нерезидент – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения.

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

Копии документов представляются без нотариального засвидетельствования.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за предмет аукциона. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на субсчет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и приведение, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона под роспись.

Договор аренды по результатам аукциона заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Телефон для справок: (8 017) 213 28 18, факс (8-017) 207 75 67.**

**г. ВИТЕБСК** **05.10.2012**

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ НАЧАЛЬНАЯ ЦЕНА ПРОДАЖИ ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОСТИ СНИЖЕНА НА 80 %

| № лота | Наименование предмета аукциона | Характеристика предмета аукциона | Начальная цена продажи предмета аукциона, рублей | Сумма задатка, рублей |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Неиспользуемые здания, сооружения, элементы благоустройства, расположенные по адресу: Витебская область, Миорский район, Заутьевский с/с, д. Остевичи, ул. Ленина, 17 и 17/1. | **Характеристика объектов недвижимости**:<br>капитальное строение с инвентарным номером 254/С-3695 (здание специализированное связи), одноэтажное панельное с бетонным покрытием, металлическим заземлителем, фундамент – бутобетонный ленточный, перекрытие деревянное, крыша шиферная, общей площадью 92,7 кв.м, 1990 г. постройки;<br>капитальное строение с инвентарным номером 254/С-9239 (здание специализированное автомобильного транспорта – производственное здание гаражей), одноэтажное кирпичное, фундамент – бутобетонный ленточный, перекрытие деревянное совмещенное, крыша шиферная, общей площадью 60,7 кв.м, 1990 г. постройки.<br>**Земельный участок**: с кадастровым номером 223381716101000008, площадью 0,1143 га для обслуживания автоматической станции связи, сроком аренды 50 лет. | 18 004 255 | 3 600 850 |

**ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. «Правды», 38, контактный телефон в Витебске: (0212) 476096, сайты: www.gki.gov.by, www.fondgosim.vitebsk.by, e-mail: votfondgi@tut.by.**

**Аукцион состоится 05 октября 2012 г. в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38.**

1. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00, **последний день приема документов 04.10.2012 до 17.00** по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38, кабинет 308. **Заключительная регистрация участников 05.10.2012 с 14.00 до 15.00**. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

**2. Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет № 3642903027026 в Региональной дирекции № 200 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369. Получатель – фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495.**

3. Участник, ставший победителем аукциона (претендентом на покупку), после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона; не позднее 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, формированием земельного участка и государственной регистрации в отношении этого земельного участка; не позднее 12 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола аукциона заключить договор купли-продажи недвижимости и договор аренды земельного участка.

**4. Информация об аукционе опубликована ранее в газете «Звязда» от 18.11.2011 № 220 (27084), от 21.12.2011 № 243 (27107), от 08.05.2012 № 86 (27201), от 06.07.2012 № 128.**

**5. В соответствии с частью третьей пункта 7 Декрета Президента Республики Беларусь от 7 мая 2012 г. № 6 земельный участок предоставляется в аренду покупателю имущества без проведения аукциона и без взимания платы за право заключения договора аренды.**

### ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Аукцион состоится **12.09.2012 г. в 10.30** по адресу: г. Гродно, ул. Карла Маркса, д. 29, 4 этаж, актовый зал.

Организатором аукциона является РУП «Белпочта» в лице Гродненского филиала РУП «Белпочта», находящегося по адресу: г. Гродно, ул. Карла Маркса, 29.

На аукционе выставляется право заключения договора аренды недвижимого имущества:

Лот №1. Помещение на 2 этаже общей площадью 16,0 кв.м, расположенное по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Калиновского, 75, здание специализированное связи, срок аренды – 5 лет, начальная цена продажи – 216 000 рублей, размер задатка – 21 600 рублей, целевое использование – размещение офисов, под производственные цели (за исключением вредных производств), оказание услуг, осуществление торговли, под складские помещения.

Арендная плата устанавливается в соответствии с Положением о порядке определения размера арендной платы при сдаче в аренду капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 29.03.2012 года № 150 «О некоторых вопросах аренды и безвозмездного пользования имуществом» (далее – Положение). При установлении коэффициента от 0,5 до 3 включительно, определенного п. 8.2 Положения, при расчете арендной платы применяется коэффициент в размере 3.

Документы на участие в аукционе принимаются с 05.09.12 г. по 11.09.12 г. в рабочее время (с 8.30 до 17.30) по адресу: г. Гродно, ул. Карла Маркса, д. 29, кабинет 302. Документы, поданные после 16.00 11.09.12 г., не рассматриваются.

Порядок оформления участия в аукционе, а также порядок проведения аукциона определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды зданий, сооружений и помещений, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров от 08.08.2009 г. №1049.

Для участия в аукционе участник в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе:
- перечисляет задаток на субсчет № 3012208530011 в филиале ОАО «Белагропромбанк», Гродненское областное управление, код 457, УНП 500826554, Гродненский филиал РУП «Белпочта»;
- подает заявление на участие в аукционе;
- заключает соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;
- предоставляет копию платежного документа о перечислении задатка.

Помимо указанных документов:
- физическое лицо предъявляет документ, удостоверяющий личность;
- индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о государственной регистрации;
- юридическое лицо (резидент Республики Беларусь) – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; нерезидент – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения.

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

Копии документов представляются без нотариального засвидетельствования.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за предмет аукциона. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на субсчет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона под роспись.

Договор аренды по результатам проведения аукциона заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола аукциона.

Извещение о проведении первого аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 18.07.2012 года.

**Телефон для справок: (8 0152) 74 61 47, факс (8 0152) 72 31 23.**

**ВНИМАНИЮ ГРАЖДАН ИЗ ЧИСЛА «ОБМАНУТЫХ ДОЛЬЩИКОВ»!**

**ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ**

**(о проекте строительства объекта «19-этажный жилой дом № 3 (по генплану) по ул. Тимошенко с долевым участием граждан»)**

**Информация о застройщике:**

Совместное белорусско-польское предприятие общество с ограниченной ответственностью «Строминвест-М», расположенное по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 70-47;

режим работы: понедельник – пятница 9.00–18.00, обед – 13.00–14.00.

Зарегистрировано Министерством внешних экономических связей Республики Беларусь от 29 апреля 1997 года № 40 в реестре общереспубликанской регистрации за № 1490 (регистрация изменения наименования МИД 21 июля 2000 г. № 1490/1) и присвоен ЕГР № 101264892.

Сведения о проектах строительства жилых домов в г. Минске, в которых принимал участие застройщик в течение трех лет, предшествующих заключению договора: жилой дом № 2, корпус 2 по ул. Притыцкого, жилые дома № 3А и 5 по ул. Неманской.

**Информация о проекте строительства:**

1. Цель проекта — строительство многоквартирного жилого дома.

Начало строительства — 2-й квартал 2011 г., окончание строительства — сентябрь 2012 г. Положительные заключения Главгосстройэкспертизы № 74-15/10 от 26.04.2010 г.

2. Местоположение строящегося многоквартирного жилого дома — г. Минск, микрорайон «Запад», жилой дом № 3 по генплану.

**Характеристика объекта.** Объект — 132-квартирный, 19-этажный крупнопанельный жилой дом, состоящий из одной секции. Вентиляция приточно-вытяжная с естественным побуждением. Оконные блоки – из ПВХ-профиля, с заполнением двухкамерными стеклопакетами. Отопление – водяное центральное. Электроснабжение – ТП 12-10 кВт. В квартирах электрические плиты.

**Цены на объекты долевого строительства**

Стоимость 1 м² для граждан из числа «обманутых дольщиков» — 7204000 (семь миллионов двести четыре тысячи) белорусских рублей.

Стоимость 1 м² для граждан, использующих государственную поддержку, будет пересчитана и определена после сдачи жилого дома в эксплуатацию.

3. Права застройщика на земельный участок подтверждает решение Мингорисполкома № 905 от 07 апреля 2011 г. Правообладателем земельного участка является СП ООО «Строминвест-М» (свидетельство о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права временного пользования от 09 апреля 2011 г. № 500/97-3698). Кадастровый номер земельного участка 500000000006006122, площадь – 0,4630 га. Благоустройство — согласно проектной документации.

4. Перечень квартир для долевого строительства: 6, 7, 8, 9, 10, 11, 12, 21, 22, 23, 24, 26, 35, 36, 37, 38, 39, 41, 56, 57, 58, 59, 60, 62, 63, 64, 65, 66, 69, 77, 78, 79, 80, 83, 84, 85, 86, 87, 90, 91, 92, 93, 94, 97, 105, 106, 107, 108, 112, 113, 114, 115, 125, 129.

5. Состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет находиться в общей долевой собственности: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания.

6. Предполагаемый ввод в эксплуатацию — сентябрь 2012 г.

7. Строительство дома осуществляется застройщиком с привлечение подрядной организации СП «Строминвест» ООО и ОАО «МАПИД».

Условия ознакомления застройщиком дольщиков с объектом долевого строительства и ходом работ по строительству можно узнать по телефону отдела реализации: 204-43-14, www.novidom.by.

Утерянный представительством Белгосстраха по Заводскому району г. Минска бланк страхового полиса по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу 2РН, 2РП серии БЛБ № 0389637 **считать недействительным.**
УНП 101883943

Утерянный представительством Белгосстраха по Центральному району г. Минска бланк страхового полиса по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БЛБ № 0026486 **считать недействительным.**
УНП 101883943

### ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества** | **Лот № 1.** Капитальное строение с инвентарным номером 224/С-27252, расположенного по адресу: Витебская область, Докшицкий район, г. Докшицы, ул. Зеленая, 3а, площадь – 389,4 кв. м, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ |
| **Собственник (владелец) имущества** | КУП «Докшицкое управление капитального строительства» |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | г. Докшицы, ул. Зеленая, 3а |
| **Стоимость имущества** | **Лот № 1 –** 132 300 000 белорусских рублей |
| **Информация об обременениях** | Обременений нет |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | г. Витебск, ул. «Правды», 32<br>14 сентября 2012 года в 11.30 |
| **Справочная информация** | Хозяйственный суд Витебской области<br>210101, г. Витебск, ул. «Правды», д. 32, каб. 304<br>http:// vitebsk.court.by/<br>Судебный исполнитель Железовский Юрий Александрович, тел./факс: (80212) 49 13 41, (8 029) 366 40 11<br>Старший судебный исполнитель Бородулин Алексей Александрович, тел. (80212) 49 13 40 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903002094 в 200 филиале ОАО «АСБ «Беларусбанк», г. Витебск, код 635, УНН 300007670, не позднее 13.09.2012.<br>Минимальная величина первого шага – 5% стоимости каждого лота.<br>В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

**Уважаемые акционеры ОАО «МАПИД»**

**12 сентября 2012 года СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**

## ОАО «МАПИД»,

**расположенного по адресу: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205.**
**Собрание созывается по инициативе Наблюдательного совета ОАО «МАПИД».**

**Собрание пройдет по адресу: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205, зал заседаний.**

**Начало работы собрания – 12 сентября 2012 года, 15.00**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**
1. Приведение уставного фонда ОАО «МАПИД» в соответствие с чистыми активами. Увеличение номинальной стоимости акции.
2. Внесение изменений в Устав Общества.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205А, к. 2 с 5 сентября 2012 по 11 сентября 2012 года либо 12 сентября 2012 года по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания с 13.30 до 14.30 по месту проведения собрания.

Список лиц, имеющих право на участие в собрании акционеров, будет составлен на основании реестра акционеров, сформированного на 5 сентября 2012 года.

Для регистрации при себе иметь следующие документы:
• акционеру общества – паспорт;
• представителю акционера – паспорт и доверенность.

УНП 100008115. **Администрация**

### ИЗВЕЩЕНИЕ

Государственное производственное объединение «Минскстрой» доводит до сведения заинтересованных лиц о внесении изменений в проектную декларацию о строительстве жилых помещений объекта «Жилой район Масюковщина. Микрорайон Масюковщина-6. Жилой дом № 8 по генплану» в г. Минске, опубликованную в газете «Вечерний Минск» 26 ноября 2010 года:

**Ожидаемый ввод жилого дома в эксплуатацию – октябрь 2012 г.**

И.о.генерального директора Г.Г.Лапаник

УНП 100071325

### ИЗВЕЩЕНИЕ

Государственное производственное объединение «Минскстрой» доводит до сведения заинтересованных лиц о внесении изменений в проектную декларацию о строительстве жилых помещений объекта «Жилой район Масюковщина. Микрорайон Масюковщина-3. Жилой дом № 13 по генплану» в г. Минске, опубликованную в газете «Звязда» 11 августа 2010 года:

**Ожидаемый ввод жилого дома в эксплуатацию – сентябрь 2012 г.**

**И.о. генерального директора Г.Г.Лапаник**

УНП 100071325

### ИЗВЕЩЕНИЕ

Государственное производственное объединение «Минскстрой» доводит до сведения заинтересованных лиц о внесении изменений в проектную декларацию о строительстве жилых помещений объекта «Жилой район Масюковщина. Микрорайон Масюковщина-6. Жилой дом № 7 по генплану» в г. Минске, опубликованную в газете «Звязда» 14 марта 2012 года:

**Ожидаемый ввод жилого дома в эксплуатацию – сентябрь 2012 г.**

**И.о. генерального директора Г.Г.Лапаник**

УНП 100071325

Наш культурны асяродак
ЖЫРАНДОЛЯ
Выпуск № 28 (157)

# ПАХОД АЎТОГРАФАЎ У ГОД КНІГІ

**У 1960 годзе я, навучэнец Магілёўскага медыцынскага вучылішча, а яшчэ і наведвальнік літаб'яднання пад апекаю Аляксея Пысіна, асмеліўся пры сустрэчы з пісьменнікамі напрасіцца на аўтограф. На танюсенькіх кніжачках Максіма Лужаніна, Янкі Брыля, Янкі Скрыгана, Васіля Матэвушава атрымаў першыя дароўныя надпісы.**

Не заўсёды аўтографы пачыналіся абавязковым словам «Дарагому...» ці «Паважанаму...» Пры шчырых стасунках з творцамі, пры ўзаемнай сімпатыі і добрасуседстве заставаліся арыгінальныя надпісы — своеасаблівыя характарыстыкі натхнёным асобам, часта і ў вершаванай форме.

Напышлівых слоў не спатрэбілася Уладзіміру Караткевічу для аўтографа на кнізе «Вока тайфуна». Дануту Бічэль-Загнетаву фатаграфаваў у Маскве з Паўлінай Мядзёлкай, у Гародні — з Васілём Быкавым, у Вільні — з Зоськай Верас, у Гудзевічах — з Алесем Белакозам... Пісаў вершы-прысвячэнні і для яе, і для Ніны Мацяш. А згадваю я пра гэта для таго, каб выказаць адно пажаданне. Вось выйшлі калісьці зборнікі эпіграм, эпітафій і яшчэ розныя тэматычныя выданні. А хто возьмецца за выданне кнігі аўтографаў нашых пісьменнікаў, дароўных надпісаў творцаў розных пакаленняў? Гэтакіх сведчанняў асаблівага жанру эпісталярыя сабралася ў мяне больш за сотню.

Вось прывезеная з В'етнама ў 1988 годзе кніга У. Караткевіча з аўтографам паэта Ле Чонг Шама. Ёсць у мяне і пераклад яго верша, прысвечанага Караткевічу. А калі хтосьці будзе гаварыць пра Уладзіміра Конана з нагоды гадавіны развітання з ім, то няхай гляне на яго аўтограф. Мне, калі ўглядаюся ў почырк, згадваюцца і аблічча чалавека, і тэмбр яго голасу, і яго ўсмешка прабіваецца праз наплывы гадоў...

Вось і новы аўтограф Івана Антонавіча— праз 40 з лішкам гадоў ад першага. І ніякага прамежку ў вечнасці.

А на зборніку Анатоля Сыса «Пан Лес» засвяціліся подпісы многіх сяброў Анатоля — у дзень развітання з ім. Выцвітаюць кветкі на магілах, а вось пакінутыя ПРЫТУЛЕННІ хочацца захаваць.

**Сяргей ПАНІЗНІК.**

# ПАЛЯВАННЕ НА «ПАЎЛІНАК»

## Нацыянальная тэатральная прэмія багацее на намінацыі

**У адрозненне ад мінулага года, сёлета Нацыянальная тэатральная прэмія павялічылася яшчэ на адну намінацыю — «Лепшы спектакль для дзяцей». На яе ўжо прэтэндуюць 8 спектакляў — лялечных і драматычных.**

Наогул адбор спектакляў на атрыманне Нацыянальнай тэатральнай прэміі сёлета ідзе больш актыўна, чым летась. Адметна, што амаль палова з паступіўшых ужо 37 заявак — гэта спектаклі пастаўленыя па творах класічнай і сучаснай беларускай драматургіі. Напрыклад, ужо вядома, што прэтэндаваць на прэмію будуць пастаноўкі, якія выклікалі шмат спрэчак і актыўна абмяркоўваліся тэатральнай супольнасцю, напрыклад: «Выкраданне Еўропы, альбо Тэатр Уршулі Радзівіл» Ф.-У. Радзівіл, С. Кавалёва Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Я.Купалы; «Пане Каханку» А. Курэйчыка Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага; «Леаніды не вернуцца на зямлю» У. Караткевіча Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Я. Коласа з г. Віцебска і іншыя.

На пачатку новага тэатральнага сезона ўсе пастаноўкі, вылучаныя на Нацыянальную тэатральную прэмію, можна будзе паглядзець у тэатрах. Але асабліва ўважліва будуць іх праглядаць члены адборачнай камісіі, якая складзе шорт-ліст тых пастановак, якія будуць намінаваны на прэмію. Усе спектаклі-прэтэндэнты ў выніковым туры можна будзе паглядзець у Мінску.

# ЯКАЯ ВОСЕНЬ БЕЗ БАШМЕТА?

**Міжнародны фестываль Юрыя Башмета пройдзе ў Беларусі сёмы раз з 23 верасня па 5 кастрычніка.**

Мерапрыемства, да якога асабліва трэба рыхтавацца — не толькі тым, хто будзе забяспечваць арганізацыю канцэртаў і ўтульны прыём гасцям, «зоркам» акадэмічнай музыкі. Асаблівая падрыхтоўка патрэбна і слухачу — каб адкласці грошай на канцэрты, якія цікавяць.

Сёлета на адкрыццё абяцаюць сустрэчу з Літоўскім камерным аркестрам пад кіраўніцтвам скрыпача Сяргея Крылова, разам з гэтым калектывам выступіць піяніст і мастацкі кіраўнік фестывалю Расціслаў Крымер. А вось Юрый Башмет будзе выступаць у адным канцэрце разам з Дзяржаўным акадэмічным сімфанічным аркестрам Рэспублікі Беларусь і харавой капэлай імя Шырмы. Дырыжыраваць будзе заслужаны артыст Расіі Аляксандр Сладкоўскі, але галоўнай тут будзе музыка грузінскага кампазітара Гія Канчэлі, як і сам аўтар у якасці ганаровага госця. Асобным канцэртам на арэне Белдзяржцырка адзначаць юбілей легенды джаза Жана-Люка Панці. Але абяцаюць нам і прэм'еру канцэрта для габоя з аркестрам Радзівона Шчадрына, які ён дазволіў першы раз выканаць менавіта ў Мінску. Разам з Дзяржаўным сімфанічным аркестрам Беларусі ў гэты вечар выступяць прафесар Жэнеўскай акадэміі музыкі Аляксей Агрынчук і віяланчэліст, лаўрэат міжнароднага конкурсу імя Чайкоўскага Аляксандр Бузлоў. І, вядома, як жа без «Салістаў Масквы» ў восеньскім Мінску? Салісты камернага аркестра пад кіраўніцтвам Башмета абяцаюць парадаваць гукамі скрыпак Страдывары і Гварнеры. Вы зразумелі: гэта нятаннае задавальненне.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

# ЧАЛАВЕК-НАСУПЕРАК

## Дзе прачытаць пра тое, чаму Алесь Адамовіч заўсёды выбіраў сумленне?

**Насуперак сардэчнаму рытму, гэты чалавек адбіваў свой рытм — хадзіў, пакуль хадзілася. Думаў, перажываў. І вельмі шмат пісаў, калі разумеў, што для яго, «інфарктніка», кожны дзень можа стаць апошнім. Баяўся не паспець. І не паспеў — дапісаць да апошняй кропкі свае мемуары з думкамі пра тое, чаго вартае жыццё і чаму яно не вартае наогул без сумлення. «Чалавек-сумленне» — так называлі Адамовіча пры яго жыцці.**


Фота Яўгена КОКТЫША.
Класікі ваеннай прозы Васіль Быкаў і Алесь Адамовіч.

Сумленна пісаць — гэта значыць пісаць пра тое, што адчуваў і бачыў на свае вочы, фіксуючы амаль дакументальна. А ён бачыў і адчуваў — яшчэ хлопчыкам, калі жыў у акупацыі. Але беларускія хлопчыкі ў тыя гады сталелі імгненна. Падмануць пра іх узрост, каб ўратаваць ад угону на працы ў Германію, можна было толькі ворагаў. І маці Алеся гэта зрабіла — у выніку дата нараджэння яе сына так і засталася ў дакументах змененая. Таму 85-ты дзень нараджэння Алеся Адамовіча мы адзначаем 3 верасня. Насамрэч ён нарадзіўся 3 жніўня і на год раней. Адамовіч не ўтойваў праўды. Не мог утаіць у сваіх творах і таго, што біялагічны і псіхалагічны ўзрост у чалавека могуць быць розныя. Чалавек можа быць юным, але свядомасць у яго як у мудраца. І тады тое, што ты перажыў, пераважвае тое, колькі ты пражыў, цісне, цісне, сціскае сэрца. У выніку яно не вытрымлівае...

Ёсць гады, якія можна палічыць. Але ёсць досвед, які ў пражытыя гады ніяк не ўціскаецца. Гэты досвед настолькі сканцэнтраваны, што яму мала ўжо аднаго чалавека, ён імкнецца выйсці вонкі, падзяліцца на безліч кавалкаў, распасціся на атамы. Але нават у выглядзе атамаў ён здольны ўтвараць новыя рэчывы, памнажацца ўжо ў іншых істотах. І тады досвед аднаго становіцца досведам многіх людзей, якія яго падзялілі. Калісьці так і было — калі людзі чыталі кнігі Адамовіча «Вайна пад дахамі», «Сыны ідуць у бой», «Хатынская аповесць», «Карнікі» і іншыя. І тады ім не трэба было тлумачыць, што такое дакументальная праўда і чаму без яе нельга. Сумленне не даруе.

Менавіта дзеля сумлення і трэба нагадваць пра Алеся Адамовіча нават тым, каму гэтае слова здаецца сёння надта архаічным. Не, ну сапраўды ж: калі ходзіш на працу, то імкнешся працаваць лепш, каб плацілі больш і каб гэтая праца была. Лагічна? Калі сутыкаешся з іншымі людзьмі, то імкнешся не рабіць ім нічога дрэннага, каб яны нічога дрэннага не рабілі табе. Лагічна? Калі жывеш, то хочаш, каб жыццё было ў радасць. Ці не так?..

— Калі ў 1991-м у бацькі здарыўся інфаркт, то яму патлумачылі, што трэба сябе берагчы. Але ён, наадварот, стаў пісаць больш. Такое адчуванне, што баяўся не паспець усё сказаць, — гаворыць **Наталля АДАМОВІЧ**. — І апошнія два гады сталі вельмі плённымі: за гэты час ён закончыў «Нямко», «Венеру», пісаў «Vixi», што ўжо адносіцца да мемуараў. Так і пазначана: «скончаныя раздзелы незавершанай кнігі». Гэта той твор, які, можа, больш раскажа пра Адамовіча, чым хто з людзей і патлумачыць, што рабіла яго такім неабыякавым па жыцці.

Дачка Алеся Адамовіча Наталля стала ўкладальніцай зборніка пісьменніка на беларускай мове, які рыхтуецца да выхаду ў «Беларускім кнігазборы». Кніга (больш за 600 старонак) павінна з'явіцца да канца года. У яе абралі самыя знакавыя творы — літаратурныя, публіцыстычныя, літаратуразнаўчыя, інтэрв'ю, лісты. «Хатынская аповесць» калісьці выходзіла на беларускай мове. Але ў 1990-я гады сам аўтар дадаў у яе некаторыя эпізоды, якія патрапяць ужо ў новае выданне. Вырашылі змясціць аповесць «Нямко», таму што ўвага да гэтага твора апошнім часам была вялікая з-за з'яўлення фільма і тэатральнага спектакля. «Vixi» (Пражытае) — фактычна аўтапартрэт у словах аўтара. Адамовіч-літаратуразнаўца хацеў паказаць, што беларуская літаратура стаіць на сусветным узроўні. Ён шмат пісаў пра рускіх класікаў — Талстога, Дастаеўскага, якога асабліва любіў. Але паказваў глыбіню Кузьмы Чорнага, Быкава, Мележа. Са многімі ліставаўся, і выбранае з перапіскі таксама ўвойдзе ў зборнік. З публіцыстычных твораў абралі знакавыя, якія мала друкаваліся, але дазваляюць адчуць беларускі боль праз усё XX стагоддзе — Курапаты, Хатынь, Чарнобыль... «Тварам да Апакаліпсісу» — даклад, які Алесь Адамовіч прамовіў у Нью-Ёрку, гучыць як сёння... Ён наогул умеў быць дакладным і ў словах, расстаўляючы адной фразай усе акцэнты. Гадоў 20 прайшло, а спрачацца няма пра што. Напрыклад, у адным інтэрв'ю вынесена ў загаловак: «Незалежнасць — гэта тая мара, якой многія жывуць і да якой яшчэ далёка». Апошняе інтэрв'ю па-беларуску надрукавала «Звязда» ўжо пасля смерці пісьменніка ў 1995 годзе: «Наш век даказаў бясілле ўсякай сілы».

Літаратуразнаўца **Міхась ТЫЧЫНА**, які напісаў прадмову да кнігі, гаворыць:

— Праблемы, якія турбавалі Алеся Адамовіча, яго прадказанні — па-ранейшаму актуальныя. На жаль, людзі баяцца нагружаць сябе праблемамі невырашальнымі ці кнігамі цяжкімі, якія вымагаюць унутранага напружання, як «Я з вогненнай вёскі» (разам з Я. Брылём і У. Калеснікам), ці «Блакадная кніга», «Хатынская аповесць». Людзі стаміліся ад размоў пра вайну. Ім прасцей сказаць: «Гэта тэма не майго пакалення, у нас цяпер іншыя праблемы, больш важныя — тая ж эканоміка, тая ж экалогія...» Але ў Адамовіча вельмі шмат не толькі пра вайну, а пра экалогію, пра наогул чалавечае выжыванне. І як літаратуразнаўца ён разбірае тыя творы, якія сёння не чытаюцца, а перачытваюцца — вось гэта вельмі важна. Бо сапраўдны твор — калі яго ахвота не толькі прачытаць, але і перачытаць. Гэта значыць, задумацца над нечым. Паводле Адамовіча, чалавек — гэта істота, якая думае. Адамовіч — занадта інтэлектуальны пісьменнік для таго, каб ім цікавіўся той натоўп, які чытае немаведама што альбо зусім нічога не чытае. Але ў новым выданні разлік рабіўся менавіта на тое, што прачытае моладзь — школьнікі, студэнты, настаўнікі, ад якіх залежыць, што будуць чытаць і разумець людзі далей, незалежна ад таго, далёка тыя падзеі ці не так ужо і далёка, калі добра падумаць. Таму што вельмі часта пра нейкія падзеі разважаюць выключна на ўзроўні: гэта было, выкрэсліваючы з іх непасрэдных удзельнікаў, якія стваралі гісторыю. Але ж трэба задаць пытанне: а што было б з чалавекам, з краінай, калі б не такія асобы, як Адамовіч?

Сумленна жыць паводле Алеся Адамовіча— гэта значыць дзеля праўды адкінуць свае інтарэсы, за якімі могуць быць рознага кшталту выгоды і зручнасці (чалавечыя і творчыя). Адамовічу выпала ўсё-такі жыць у той час, калі тое, што ты напісаў, рабіла аўтара аўтарытэтам, меркаванне якога можа быць пачута. Праўда, зусім не факт, што гэтае меркаванне ўсіх задавальняла. Хутчэй, наадварот. Права на сваё меркаванне за савецкім часам адстойвалі толькі тыя, хто разумеў, што за жыццё трэба змагацца, а не дрыжаць. Можа, каб не было ў Адамовіча такога ранняга сталення, не было б у яго такога бескампраміснага меркавання, якое пазбаўляла страху патрапіць «не ў струмень». Для савецкіх пісьменнікаў — небяспечная якасць, таму што можна было патрапіць у стан дысідэнтаў, а то і яшчэ куды. І быў такі павучальны прыклад — лёс пісьменнікаў Даніэля і Сіняўскага, якія сваімі «паклёпніцкімі, антысавецкімі» творамі моцна не падабаліся ўладным начальнікам. Працэс над Даніэлем і Сіняўскім у 1960-я гады быў гучны і паказальны, а пакаранне жорсткім па тым часе — лагер, калонія. Іх прозвішчы сталі свайго роду «лакмусавай паперкай» дзеля праверкі іншых пісьменнікаў на адданасць курсу партыі. Усяго толькі і трэба было, што падпісаць ліст з асуджэннем «здраднікаў». І шмат хто падпісаў: не, не дзеля сапраўднага асуджэння, а ўсяго толькі каб мець творчую магчымасць размаўляць з людзьмі. Толькі не Адамовіч. Ён не падпісаў гэты ліст. У выніку — быў звольнены з МДУ, дзе тады выкладаў... Але хіба ж гэта страты?.. Для яго гэта быў, хутчэй, новы досвед: як не згубіць сябе. І ведаеце — атрымалася. А ўдзячнае жыццё падкідвала працу: да літаратуры дадалося кіно, Алесь Адамовіч сам пісаў сцэнарыі да фільмаў, якія — як «Ідзі і глядзі» (рэжысёр Э. Клімаў) у свой час таксама пераварочвалі свядомасць.

Потым ён яшчэ будзе мець магчымасць гэты досвед удасканаліць — на радзіме, у Беларусі, не ведаючы спакою ў спрэчках з начальнікамі, якім не даваў сядзець спакойна гэты нязручны чалавек. Голас Адамовіча быў ужо вельмі моцны. І гэта быў голас Беларусі, які набіраў новую моц і хацеў гучаць самастойна. Ён заспеў беларускую незалежнасць, але не ўбачыў яе ў буянні колераў шчасця, у бляску ад чысціні нашых вуліц, у паўнаце асэнсавання ролі ўсіх яе атрыбутаў, якія клічуць на працоўныя і чалавечыя подзвігі. Не дажыў. Але нельга сказаць, што не ведаў пра яе, пра такую. Ён добра ведаў сваю радзіму — гэты досвед не быў бы для яго новым. Таму ён пакінуў галоўнае: прыклад сумлення, калі асабістае непадзельнае ад грамадскага, і калі ў мастацкім больш праўды, чым выдумкі. Калі, прачытаўшы Адамовіча, ведаеш, што насамрэч здольны перажыць беларускі чалавек, колькі выцерпець жудасных пакут, здзекаў, смерцяў родных і блізкіх, голаду і адчаю, то становіцца сапраўды страшна — за сябе і тых, каго любіш. Пра жорсткае трэба ведаць, каб разумець, як не дазволіць яму выйсці з-пад кантролю і правіць баль.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

## Ад аўтара:

**Калі я вучылася ў школе, на экраны выйшаў фільм «Ідзі і глядзі» паводле сцэнарыя Алеся Адамовіча. Мы пайшлі глядзець яго ўсім класам — тады такія «культпаходы» былі вельмі распаўсюджаны. Разыходзіліся дадому ўзрушаныя. Некаторыя дзяўчаты плакалі, казалі: «Як гэта страшна...» Затое такой утульнай, спакойнай, ціхай здавалася дарога дадому, нават калі прыходзілася збочыць з галоўнай вуліцы, на якой тады толькі і свяцілі ліхтары. Але ўявіце: савецкія падлеткі, глытнуўшы свежага паветра, спакою паўсоннага правінцыйнага горада, разважалі не пра перавагі мірнага жыцця, на якое пашчасціла нашаму пакаленню, а пра неабходнасць праўды, магчымасць даравання і пакарання: «Без пажару было б лепш... — Без пажару была б казка...» — «Чаму ён не стрэліў у фатаграфію малога Гітлера?..» — «Дыктатарамі не нараджаюцца, імі становяцца ў залежнасці ад абставін, якія ствараюць людзі...» — «Але цярпелі невінаватыя...» — «Таму яны і перамаглі, што не пагадзіліся цярпець...» На наступны дзень на ўроку настаўніца беларускай літаратуры папрасіла напісаць свае думкі пра гэты фільм. Мы напісалі. А потым мой допіс быў надрукаваны ў раённай газеце. Гэта была мая першая газетная публікацыя. Першая, але я дагэтуль лічу яе адной з лепшых і ні слова б у ёй не паправіла зараз, не паставіла б пад сумнеў сваю думку: праўды зашмат не бывае...**

# У ЧАСЕ ЛІТАР

**У беларускай мове ёсць цудоўнае слова «часопіс». Настолькі змястоўнае і дакладнае, што не трэба доўга тлумачыць яго паходжанне: пісаць пра час. У людзей ёсць дзіўнае жаданне са старажытных часоў апісваць, як ішло жыццё, паказваць самыя балючыя і драматычныя моманты — каб тыя, хто будзе жыць пасля, зрабілі высновы. І каб потым маглі вывучаць папярэднюю гісторыю не толькі праз канкрэтныя факты, але і праз пачуцці. Гэта прывілея літаратуры. Таму, калі ў народа ёсць свая літаратура, то ёсць неабходнасць часопіса, які б адлюстроўваў найбольш моцныя для яго пачуцці ў сувязі з пэўнымі падзеямі.**





**90 гадоў таму ў беларусаў з'явіўся літаратурны часопіс «Полымя» — і гэта была таксама праява часу, лічыць яго цяперашні рэдактар Мікола МЯТЛІЦКІ. Мы размаўляем пра літаратуру, якая прыходзіла да чалавека праз старонкі часопіса ўсе гэтыя гады, і я імкнуся зразумець, як яна ўплывала на людзей тады, на пачатку жыцця выдання? Ці ўплывае зараз, і як?**

## Гісторыя

— Часопіс «Полымя» быў заснаваны ў снежні 1922 года на першай хвалі беларускага адраджэння. Магчыма, і назва адсюль: маладая нацыя патрабавала духоўнага азарэння, вялікага агню, да чаго мы ўвесь час імкнуліся пад дэвізам бессмяротнага Янкі Купалы — «людзьмі звацца», — гаворыць Мікола Мятліцкі. — «Полымя» згуртавала вакол сябе ўсю тагачасную беларускую эліту — навуковую, культурную, творчую. Калі з сённяшніх пазіцый глядзіш у той час, то бачыш, якая гэта была вялікая рупнасць, якая была неспатольная смага — наталіцца ўласным лёсам, уласнай культурай, пра што казалі ў сваіх творах Янка Купала і Якуб Колас.

**— Для перыядычнага выдання заўсёды важна, хто стаіць на чале, тым больш, для літаратурнага...**

— З 1922-га па 1932 год часопіс узначальвала рэдакцыйная калегія, куды ўваходзілі Цішка Гартны, Змітрок Бядуля, Усевалад Ігнатоўскі, Васіль Нодаль. У 1932 годзе першым галоўным рэдактарам часопіса прызначылі Платона Галавача, які быў не толькі цудоўным празаікам, пісьменнікам, але і вядомым грамадскім дзеячам. Але ўжо ў 1933-м Галавач быў вызвалены ад абавязкаў галоўнага рэдактара. Разам з Алесем Дударом і Анатолем Вольным яны былі расстраляны на тэрыторыі сённяшняга парка Чалюскінцаў у дзень нараджэння камсамола. Гэта адна з вельмі трагічных старонак нашага часопіса. Рыхтуючыся да 90-годдзя, мы вырашылі расказаць пра лёсы некаторых з тых аўтараў і рэдактараў, якія з самага пачатку былі з «Полымем». У №4 за гэты год мы расказалі пра жыццёвы і творчы шлях Цішкі Гартнага ў артыкуле Серафіма Андраюка. У снежаньскім нумары — пра першага рэдактара Платона Галавача. Адным з самых адметных рэдактараў быў Максім Танк, які з 1957 года на працягу 18 гадоў узначальваў часопіс. У верасні адзначаецца стагоддзе з дня нараджэння Максіма Танка. Мы падрыхтавалі пра яго два грунтоўныя артыкулы Міколы Мікуліча.

Наогул гэты год пазначаны вялікімі юбілеямі карыфеяў нашай літаратуры Янкі Купалы і Якуба Коласа, якія прымалі ўдзел у стварэнні часопіса «Полымя», ім мы прысвяцілі шэраг матэрыялаў. Даваенныя гады сталі вялікай часткай нашай гісторыі, і асабліва гісторыі нашай літаратуры, таму што ўсё тое вартаснае, што друкавалася ў тыя часы на старонках часопіса «Полымя», ужо даўно стала хрэстаматыйна вядомым у нашай краіне, вывучаецца ў школах. Творы Купалы і Коласа, Цішкі Гартнага, амаль усе творы Кузьмы Чорнага, якія пабачылі свет на старонках часопіса, творы Максіма Гарэцкага...

У вайну часопіс не выходзіў, адрадзіўся ён у 1945 годзе ў студзені. Гэты факт асабліва для мяне ўзрушальны: Беларусь ляжыць у руінах, а ўжо была вялікая духоўная патрэба ў людзей чытаць пра тое, што на той момант хвалявала. Літаратурныя творы друкаваліся і ў вайну. Мы ведаем гістарычны факт, што нават у партызанскім атрадзе выйшаў зборнік паэта Анатоля Астрэйкі «Слуцкі пояс», у Маскве друкаваліся творы Янкі Купалы, Якуба Коласа і іншых паэтаў, а потым дастаўляліся на акупаваную тэрыторыю. Многія захоўваюць гэтыя рэліквіі — лістоўкі з творамі. А ў студзені 1945 года ўжо выходзіць часопіс «Полымя» накладам 5 тысяч экзэмпляраў! Я ўспамінаю адну са сваіх гутарак з народным пісьменнікам Беларусі Іванам Шамякіным, які ў паваенным «Полымі» друкаваў сваю «Глыбокую плынь». Ён расказваў, як у бібліятэках бачыў да дзірак зачытаны часопіс. Я думаю, што літаратура ў тыя часы была з чалавекам як ніколі, яна дапамагала яму аднаўляць разбураную краіну, суцяшала на папялішчы, давала моц духу. У літаратуру прыйшло цэлае пакаленне пісьменнікаў з ваенным вопытам, з загартаванай мужнасцю. У пасляваенныя гады ў цесных пакойчыках рэдакцыі збіраліся пісьменнікі-франтавікі: Іван Мележ, Аркадзь Куляшоў, Максім Танк, Кандрат Крапіва, Пятрусь Броўка, Васіль Быкаў, Іван Шамякін. Пакаленне, якое на сваіх плячах разам з краінай узняло беларускую літаратуру да сусветнага ўзроўню. Гэта былі самыя плённыя гады — адбылося станаўленне жанру рамана, гэтаму была прысвечана «палымянская» дыскусія 1960-х гадоў. Тады выйшлі ў свет «Людзі на балоце» Івана Мележа, «Птушкі і гнёзды» Янкі Брыля, «Сэрца на далоні» Івана Шамякіна, «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» Уладзіміра Караткевіча. Ужо быў паварот да гістарычнай тэмы, якую сёння асабліва падхапіла наша моладзь.

## Традыцыя

**— У часопісе «Полымя», які ёсць сёння, можна адзначыць акадэмізм — думак, ідэй, пісьма... Гэта даніна традыцыі?**

— З самага пачатку часопіс займеў статус акадэмічнага выдання, так ён задумваўся, каб была пэўная навуковая аснова. Таму што ў 1922 годзе «Полымя» імкнулася народ багата чаму навучыць. Адным з членаў рэдкалегіі часопіса быў Усевалад Ігнатоўскі, вядомы вучоны, першы Прэзідэнт Акадэміі навук. Мы і сёння захоўваем вялікія стасункі з Акадэміяй навук нашай краіны. У рубрыцы «Беларуская навука» мы шмат расказалі пра вядучыя акадэмічныя інстытуты, пра тыя ж нанатэхналогіі. Гаварыць пра нашу навуку — гэта значыць гаварыць пра нашу будучыню. Але і часопіс бярэ ўдзел у навуковых канферэнцыях і пасяджэннях «круглых сталоў» прысвечаных, напрыклад, 600-годдзю Грунвальдскай бітвы, ці юбілею Полацка, калыскі нашай дзяржаўнасці, ці невядомым старонкам Вялікай Айчыннай вайны. Пяць гадоў таму на канферэнцыі, прысвечанай юбілею «Полымя», мы паднялі дакументы 1920-х гадоў, якія ў свой час былі засакрэчаны: балючыя асабістыя лісты пісьменнікаў, у тым ліку «пакаяльныя», многія дзяржаўныя дакументы, уплыў якіх на лёсы людзей можна прасачыць сёння, калі прыходзілі ноччу, бралі гэтых людзей па чыёйсьці наводцы. Калі бярэш у рукі тое ж пісьмо Панамарэнкі Сталіну, дзе прапануюцца да пакарання Колас, Купала, думаеш: які час быў...

Мы не губляем традыцый нашых папярэднікаў, таму што ведаем, што за літаратурныя творы плаціліся і крывавыя ганарары. Сёння мы расказалі пра ўсіх рэпрэсіраваных пісьменнікаў Беларусі, каб было менш белых плямін, таму што яны ўвасаблялі актыўны нацыянальны, грамадзянскі рух насустрач краіны, якую мы сёння маем.

Сённяшні этап вельмі адрозніваецца ад папярэдніх, бо мы марым мець краіну, якая будзе працвітаць у дастатку, і тут захочацца чагосьці больш вартаснага, больш эстэтычнага, больш прывабнага. Калі гаворыш з нашымі маладымі пісьменнікамі, то яны акрэсліваюць сваё кола тэм ужо з аглядкай на цэлы свет, ідзе пошук сусветнага ўзроўню, можа, у нейкім фармальным кірунку. Хоць я больш чым перакананы: калі мы недададзім свайго нацыянальна-адметнага, то гэты ўзровень вельмі прасядзе. Сусветны ўзровень якраз і ствараецца творчымі высілкамі ўсіх народаў — ён не абстрактны, а вельмі канкрэтны. Я не магу ўявіць беларускую літаратуру без «Новай зямлі» Якуба Коласа. А што гэта не сусветны ўзровень? Мы ў юбілейным «коласаўскім» нумары будзем весці сур'ёзную гаворку пра гэты твор...

## Сучаснасць

**— Ці ёсць глеба для творчага росту будучых аўтараў, якія стануць як Колас, Мележ?**

— Пошук новых аўтараў — гэта агульнарэдакцыйны клопат. На наша шчасце, маладыя аўтары ёсць. Вядома, іх не столькі, як хацелася б. Тое, што з'яўляецца ў паэзіі сёння, на жаль, не ўсё падыходзіць для часопіса «Полымя». Мы хочам літаратурнай самаснасці, калі да нас прыходзіць імя. Мінулы год мы адкрылі цудоўнейшымі вершамі тады яшчэ студэнта Гомельскага ўніверсітэта Алеся Бараноўскага. Я пачытаў яго кніжачку «Вясляр» і пазначыў у ёй 24 вершы, якія могуць быць надрукаваны ў «Полымі». Яшчэ раней мы адкрылі Рагнеда Малахоўскага — прыйшоў 17-гадовым юнаком каля дзесяці гадоў таму. Даслаў нам вершы яшчэ дзевяцікласнікам пяць гадоў таму Павел Барахвостаў. Гэта быў адзін з ярчэйшых дэбютаў. Яшчэ школьнікам прыйшоў Алёша Бруй, прынёс навелы — мы ахнулі: мінскі школьнік так цудоўна ведае беларускую мову! Ужо некалькі разоў ён друкаваўся ў нас. Мы вядзём працу з нашым філалагічным факультэтам. Я лічу, што ён па праве з'яўляецца кузняй літаратурных кадраў. Вельмі насычаная наша рэдакцыйная пошта. Нядаўна прыйшлі па электроннай пошце вершы Станіслава Валодзькі, які жыве ў Латвіі і збоку глядзіць на нашу Бацькаўшчыну.

На наступны год будзем друкаваць працяг рамана Уладзіміра Гніламёдава «Ліхалецце». Віктар Праўдзін абяцае другую частку рамана «Нелюбімыя гінуць», пра рабатаргоўлю. Ёсць раманы Зінаіды Дудзюк, якая ў большасці піша на гістарычную тэму. Новыя творы Ніны Рыбік, якая жыве ў Астраўцы. Новы раман абяцае Віктар Супрунчук...

Мы шмат удзяляем увагі перакладам — друкавалі творы з польскай, сербскай, казахскай, турэцкай літаратуры. Калі мы пачалі жыць незалежна, то мала ведаем, якое літаратурнае жыццё ў былых суседзяў. Сёння ў Год кнігі мы збіраемся на Дзень беларускага пісьменства правесці «круглы стол» з перакладчыкамі, гасцямі Беларусі. Нам ёсць што адкрываць у сусветнай літаратуры. Таму «Полымя» друкуе творы з кітайскай паэзіі, якая для нас невядомая. У Кітаі пісьмовая паэзія існуе ўжо 24 стагоддзі! Калі чытаеш вершы пра хрызантэму, напісаныя да нашай эры, потым сярэднявечныя і яшчэ сучасныя, думаеш: якое жыццё вечнае! Чалавек глядзіць на свет тымі ж вачамі, любуецца той жа расінкай на пялёстках. Гэта ёсць пашырэнне духоўных межаў, таму што ты ж у свеце не адзін, цікава: а што ў другіх, а як яно гучыць на тваёй мове? Колькі зрабіў у гэтым плане незабыўны Янка Сіпакоў: адкрыў старажытную паэзію Вавілона, Грэцыі, Рыма. Гэта дае адчуванне, што літаратура ва ўсе часы з'яўлялася нейкім вялікім маральным памкненнем чалавека.

## Мова

**— У такога часопіса, як «Полымя», ёсць вельмі важная місія — вызначаць узровень сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Як «Полымя» сёння шукае свайго чытача?**

— Чытач «Полымя» падрыхтаваны, сталы. Я шмат вандрую па нашай краіне, і нідзе ні разу не пачуў, што мова часопіса незразумелая. Мы вядзём рубрыку «Культура мовы», дзе дасведчана гаворым пра дыяменты нашай мовы, якімі яна адметная. Мы не кідаемся ў нейкія выкрутасы, у штучнасці. Гэта палымянская традыцыя — каб мова была натуральнай, жывой, глыбіннай. На шчасце, чытачы яе разумеюць і прымаюць. У мяне была выпадковая сустрэча на Астравеччыне ў вёсачцы Рытань. Падышла ў Доме культуры пажылая жанчына і з удзячнасцю прамовіла: «50 гадоў чытаю «Полымя», не прапусціўшы ні адзін нумар. Мне часопіс нясе вялікую радасць». Неаднойчы я чуў водгукі такога кшталту, гэта яшчэ больш абавязвае і ўзмацняе нашу рэдакцыйную адказнасць. Мы стараемся, каб часопіс быў насычаны ва ўсіх сваіх частках — у мастацкай, публіцыстычнай і навуковай. Ёсць розныя рубрыкі: «Постаці», «Наш край», дзе ствараецца партрэт нашай Бацькаўшчыны; «Школьныя далягляды», каб наблізіць літаратуру да школы. Мы хочам, каб была зваротная сувязь.

## Будучыня

**— Для будучыні літаратуры важнае развіццё: у тэмах, у іншым поглядзе, у здольнасці эксперыментаваць. Ці прапаноўваюць літаратары такія творы?**

— Такіх твораў не так і многа. Але я не стаў бы гаварыць пра літаратуру як пра нейкую фармальную з'яву, таму што першасны змест, у якім духоўная сіла, якая рухае літаратуру. Будзе новы змест — з'явіцца новая форма. Прасачыце нашу ваенную (я б сказаў антываенную) літаратуру, якая стваралася людзьмі з пэўным гістарычным вопытам. Што, на нейкай абстрактнай пляцоўцы вырасла творчасць Васіля Быкава? Ці таго ж Івана Шамякіна? Ці Івана Мележа?.. Янкі Брыля? Іх творчасць натхнялася канкрэтнымі падзеямі, якія сталі падставай для глыбокіх абагульненняў. Такіх прыкладаў у нашай літаратуры многа, і гэта тыя духоўныя арыенціры, якія будуць і далей яе рухаць. Я ўпэўнены, што і ў XXI стагоддзі беларуская літаратура застанецца адной з самых гуманных літаратур свету, таму яна мае бясцэнны вопыт, які будзе духоўнай дамінантай. Я маю на ўвазе, што мы гаворым пра літаратуру як пра вялікую з'яву, а не як пра нейкае самавыяўленне, калі пісьменнік думае, як даць у твор больш асабістага, толькі яму аднаму вядомага. Але ёсць літаратура, праз якую нас бачаць у цэлым свеце. Нездарма ж па інфармацыі ЮНЕСКА, сем гадоў запар самым чытаемым пісьменнікам планеты станавіўся беларус Васіль Быкаў. Хацелася свету паглядзець, што гэта за народ, які выстаяў, з адметнай мужнасцю. Гэты вопыт губляць нельга, ім трэба кіравацца далей.

Але заўсёды кажуць: калі ёсць 3-4 моцныя пісьменнікі на дзесяцігоддзе — гэта здорава. Сёння моладзь, якая прыходзіць у літаратуру, падрыхтаваная, дасведчаная, таму варта ставіць больш маштабныя задачы перад сабой. Іх можна рэалізаваць у наватарскім стылі. Напрыклад, сёння раман можа быць 40 старонак: час сціснуты, і твор сканцэнтраваны глыбінна. Сама стылістыка літаратуры можа быць рознай. Але гэта павінна быць напісана сэрцам, вялікім інтэлектам. Мы заклапочаныя будучыняй, таму што ведаем, што большасць нашых пісьменнікаў сцвердзілася ў мінулым стагоддзі. Як бы мы таго ні хацелі, мы застаемся пісьменнікамі XX стагоддзя. На двары XXI стагоддзе. Вядома, гэта тычыцца не толькі «Полымя», але і ўсёй нашай літаратуры — яна ўглядаецца ў сваю будучыню. Будуць новыя імёны, новыя творы, якія стануць побач з лепшымі дасягненнямі нашай літаратуры. Многія з іх ужо напісаны.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**




# Беларускія таямніцы:
# «МСЦІСЛАЎСКІЯ РУЧНІКІ»

**У наш час старажытныя славянскія традыцыі практычна забыты, але заўсёды знойдзецца чалавек, які цягнецца да вытокаў гісторыі: бо столькі цікавага і незвычайнага ў народнай творчасці нашых продкаў. Кожны ў той час знаходзіў занятак па душы, быў гэта ганчар, каваль, ці жанчына, якая займалася рукадзеллем.**

Адным з заняткаў нашых бабуль з'яўлялася тканне ручнікоў, якія яны ўпрыгожвалі рознымі ўзорамі. Вышытыя на ручніку, яны служылі ўпрыгажэннем паўсядзённага побыту, цяпер з'яўляюцца сімвалічным напамінкам пра нябачныя сувязі, якія злучаюць кожнага чалавека з яго родам, продкамі.

Так аднаўленнем гісторыі і багацця ручнікоў на Мсціслаўшчыне займаецца вучаніца 8-га класа Капачоўскага вучэбна-педагагічнага комплексу дзіцячы сад—сярэдняя школа Святлана Мядзведская пад кіраўніцтвам настаўніка абслуговай працы Іны Мікалаеўны Мядзведскай. Мэта працы Святланы — аднаўленне ручнікоў, вывучэнне асаблівасцяў іх афармлення на Мсціслаўшчыне, удакладненне народных традыцый. Прадмет даследавання — ручнікі Мсціслаўскага раёна, выраблены ў канцы XIX — пачатку XX стагоддзя.

«Лічу, што мая даследчая праца павінна спрыяць захаванню і аднаўленню старадаўніх ручнікоў, якія, калі наладзіць вытворчасць, можна будзе прадаваць у якасці сувеніраў на базе адпачынку «Сямігор'е». Адноўленыя мсціслаўскія ручнікі стануць каштоўнымі падарункамі, якія захоча набыць кожны турыст», — перакананa Святлана, якая бачыць у гэтым практычную значнасць сваёй працы.

Іна Мікалаеўна Мядзведская распавяла, што першы ручнік, над якім яны працавалі, нясе ў сабе магічнае значэнне: багацце на стале і дабрабыт у сям'і. Спалучэнне арнаменту і колеру дазваляюць выкарыстоўваць яго ў якасці вясельнага ручніка або ручніка-набожніка, бо ўзор яго з'яўляецца сапраўдным ахоўнікам сям'і і гаспадаркі. Спрадвеку ручнік меў не толькі эстэтычнае прызначэнне, але і рытуальна-абрадавае.

Таму дагэтуль ручнікамі ўпрыгожваюць жыллё, іх выкарыстоўваюць у разнастайных абрадах у некаторых рэгіёнах сучаснай Беларусі.

Праца над узнаўленнем ручнікоў працягваецца далей. Можна з упэўненасцю адзначыць, што традыцыі народнай творчасці нашых продкаў ніколі не згінуць, бо заўсёды знойдзецца чалавек, які будзе працягваць.

**Наталля ЦІХАНОЎСКАЯ.**


Святлана МЯДЗВЕДСКАЯ з адноўленым ручніком.

■ Правер сябе

(ТУР 2)

# ПЫТАННІ ДЛЯ ЦІКАЎНЫХ

Шаноўныя чытачы! Мы вельмі рады, што вы шчыра адгукнуліся на нашу прапанову разам даследаваць родную гісторыю, даслаўшы свае адказы на пытанні «Гістарычнай віктарыны». Правільна на ўсе пытанні адказалі Аляксандр Ганчароў (п.а. Нісімкавічы Чачэрскага раёна), Сяргей Кулакевіч (г. Жыткавічы), Уладзімір Драбышэўскі (г. Полацк), а таксама Юлія Жалабковіч. А для тых, хто «пацэліў» крыху міма, прыводзім правільныя адказы: 1. Сейм; 2. «Ліберум вета»; 3. 1591; 4. Мінск; 5. Ігнат Буйніцкі; 6. Візітоўка; 7. Мінскі гарадскі тэатр, сучасная назва — Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Я. Купалы; 8. Запуск паветранага шара.

Нагадваем, пераможцы будуць вызначацца па выніках усіх тураў віктарыны. Таму не губляйце цікавасці, а ў сваіх лістах пазначайце кантактную інфармацыю, па якой з вамі можна будзе звязацца.

*Усяго некалькі крокаў — і будзённая мітусня застаецца за дзвярыма. Прыходзячы ў Нацыянальны гістарычны музей, наведвальнік трапляе на спатканне... з гісторыяй.*

*На экспазіцыі «Старажытная Беларусь» яна ажывае ў бранзалетах і пацерках маладых крывічанак, у пышных карунках «Царскай брамы», у чарапках ляпной керамікі і зіхценні нёманскага шкла, у змрочнасці паганскага ідала і суме драўлянага распяцця Хрыста. Сёння, паважаны чытач, менавіта гэтай тэме і будуць прысвечаны пытанні нашай віктарыны:*

1 Як называецца дэкаратыўная брошка для зашпільвання верхняга адзення, што выкарыстоўвалася ў старажытных народаў з бронзавага веку да 14 ст.?

2 Як называюць металічны, найчасцей бронзавы, двухстворкавы нагрудны крыж-складзень, выкананы ў тэхніцы ліцця?

3 Нясвіжскі рысавальшчык і гравёр, які выканаў 1-ю дакладную карту ВКЛ (каля 1603 года; захавалася 2-е выданне 1613 года). Таксама стварыў гравюры з відамі Вільні, Нясвіжа, Трокаў, Клецка, Біржаў, Гародні, шэраг ілюстрацый да выданняў таго часу.

4 Звод законаў феадальнага права, які дзейнічаў у Беларусі і Літве ў розных рэдакцыях з 1529 (першае выданне) у асобных губернях да 1840 года (апошняе выданне 1588 года).

5 Апалчэнне ў магнацкіх гарадах ВКЛ у 16-18 ст., а таксама прыватнае войска магнатаў ў Рэчы Паспалітай у 18 ст.?

6 Гісторыя гэтага замка адметная важнымі палітычнымі падзеямі. Тут у 1381 годзе знаходзіўся на выгнанні Ягайла, пазбаўлены трона ВКЛ сваім стрыечным братам Кейстутам. У 1382 годзе ўжо Кейстут патрапіў у зняволенне і тут, паводле загаду Ягайлы, быў задушаны. У гэты ж час у замку быў зняволены князь Вітаўт, але ён здолеў уратавацца. Нарэшце, менавіта тут у 1385 годзе быў падпісаны акт уніі паміж ВКЛ і Польшчай. Пра які знакаміты замак ідзе гаворка?

7 Папяровы ярлык, які наклейваецца ўладальнікам бібліятэкі на кнігу, пераважна на ўнутраны бок пераплёту. Звычайна на ім пазначана імя і прозвішча ўладальніка, а таксама малюнак, які лаканічна ці вобразна апавядае аб яго прафесіі, інтарэсах, складзе бібліятэкі.

8 Прыгонная шкляная мануфактура, заснаваная ў 1717 годзе Радзівіламі. Адна з найбуйнейшых шкляных мануфактур 18-19 стст. у Беларусі. Выраблялa люстэркі, жырандолі і падсвечнікі, шмат мастацкага і побытавага посуду. Пра якую мануфактуру ідзе гаворка?


Лысая Гара.

# Гасцінцамі Купалы, бальшакамі Коласа

## ВЯЗЫНКА... АКОПЫ І ХАРУЖАНЦЫ, ЯХІМОЎШЧЫНА І ЛЯЎКІ...

**Акінчыцы, Ласток і Альбуць, Смольня і Мікалаеўшчына... Назвы, якія даўно і трывала ўвайшлі ў наша жыццё і атаясамліваюцца з паняццем святых мясцін. Нездарма ў куточкі, дзе пад густымі шатамі дрэў хаваюцца хаты-музеі і валадарыць цішыня, напоўненая водарам светлай паэзіі, нас заўсёды вабіць, як вабяць да сябе невычэрпныя і гаючыя крыніцы. Дастаткова пачуць гэтыя знаёмыя з дзяцінства назвы, каб імгненна ўявіць постаці нашых духоўных папярэднікаў Янкі Купалы і Якуба Коласа.**

Амаль адначасова наша зямля стала калыскай песняроў. 1882 год быў для Беларусі неверагодна шчодрым. Ніколі дагэтуль зямля не ведала большай ласкі. Як пасланцы нябёсаў прыйшлі паэты, каб разам засведчыць перад усім светам, а найперш самім сабе, што мы народ з моцнымі каранямі, глыбокай гістарычнай памяццю і, бадай самае галоўнае, маем сваю спрадвечную мову. На гэтай мове паэты праспявалі свае лепшыя песні і ўславілі родную зямлю.

Але ж зямля паэтаў не абмяжоўваецца пералікам толькі добра вядомых мясцін. Нібы ў паралельным свеце існуе яшчэ шмат куточкаў, таксама звязаных з іх імёнамі, іх зямнымі і творчымі лёсамі. З Купалам знітаваны **Юзафова і Косіна, Прудзішча і Селішча, Бараўцы і Бясяды, Карпілаўка і Лысая Гара...** Якуба Коласа памятаюць **Падбярэжжа і Вусце, Беразянка і Балачанка, Ждановічы, Каралішчавічы, Верхмень.**


Акінчыцы.


Прудзішча.


Акінчыцы.


Лагойшчына.


Акопы.

На жаль, час непераможны, ён здольны мяняць аблiччы краявідаў і сціраць з твару зямлі цэлыя вёскі. Што ўжо казаць пра маленькія хутары, якімі калісь была ўмацавана зямля дзядоў і прадзедаў! З цягам часу пазнікалі і шляхі, што нітавалі вольна раскінутыя гаспадарскія сядзібы і нават больш значныя гасцінцы і бальшакі — тыя, што выводзілі будучых паэтаў на шырокія абсягі іх неспакойнага жыцця. І ўсё ж на радзіме паэтаў — **Лагойшчыне і Стаўбцоўшчыне**, наперакор зменліваму часу, некаторыя колішнія назвы працягваюць жыць у назвах урочышчаў і проста ва ўспамінах людзей старэйшага пакалення. У лёсе Купалы гэта былі **Міхалішкі, Ляўшова, Айчызна, Рубеж, Здарэнне, Тукалаўка, Шкоды, Калдукоўка і Гайдукоўка, Верацейкі і Лугаўцы, Прытыкі і Парабкі...** На радзіме Коласа таксама існуе цэлае сузор'е назваў, якія выклікаюць пэўныя асацыяцыі і пачуцці: **Чартавіцы, Лядзіны, Церабяжы, Карчэведзь, Канцывалокі, Кліны, Клешчыцы, Ёлава, Яськаў Брод, Конскі Брод, Дворны Брод, Міхалаў крыж, Лявонаў лужок, Раймусава Шырокая...**

Каб глыбей спасцігнуць драматургію літаратурнай спадчыны песняроў, большасці з нас давядзецца яшчэ неаднойчы выправіцца ў патаемныя куточкі нёманскага краю і прайсці тупкімі сцежкамі на памежжы **Лагойшчыны і Міншчыны** — менавіта там, дзе славутыя папярэднікі назапашвалі свой жыццёвы досвед, дзе пачыналася і мацнела іх жывое і прарочае слова.

**Анатоль КЛЯШЧУК.**
**Фота аўтара.**




**«Выдавецтва «Беларусь» выпусціла альбом фотакарэспандэнта «Звязды» Анатоля Клешчука, прысвечаны памятным мясцінам, звязаным з жыццём Купалы і Коласа. Фотаальбом можа стаць выдатным падарункам не толькі на Дзень беларускага пісьменства, але і на любую памятную дату.**

# Манетны шлях Валянціна Рабцэвіча

## Скарбы нумізматычнага кабінета

**Хто з нас не марыў адшукаць сапраўдны скарб, што некалі быў схаваны на час ліхалецця, да лепшай пары, ды так і застаўся ляжаць у зямлі? Хто не думаў, што дзесьці ў сутарэннях старых пабудоў у сцяне раптам стане бачна штосьці цвёрдае і бліскучае, ды і зазвініць, сыплючыся пад ногі? Адшукаць скарб — гэта тое, што мараць зрабіць усе летуценнікі, неабыякавыя да гісторыі. Некаму шанцуе і сёння. Калекцыя нумізматычнага кабінета на гістфаку БДУ дагэтуль папаўняецца новымі цікавымі знаходкамі.**

Стваральнік кабінета, апантаны нумізмат Валянцін Рабцэвіч, які, дарэчы, лічыцца пачынальнікам беларускай нумізматыкі, адкрыў яго, ахвяраваўшы ўласныя калекцыі. Нумізматычны кабінет быў адзіным у Беларусі ў тыя часы. Ды і сёння аналагаў не мае. Варта дадаць, што ў 1995 годзе Рабцэвіч выдаў свае грунтоўныя даследаванні ў кнізе «Нумізматыка Беларусі».

Зараз захавальнікам адзінага ў сваім родзе нумізматчынага кабінета з'яўляецца Віталь Сідаровіч — загадчык вучэбнай лабараторыі музейнай справы гістарычнага факультэта БДУ. Нам выпадкова ўдалося сустрэцца з ім паміж дзвюма працяглымі археалагічнымі экспедыцыямі, у якіх ён браў удзел. Віталь Сідаровіч прыадкрыў карэспандэнту «Звязды» некаторыя таямніцы нумізматчынага кабінета, у які, між іншым, любы ахвотны трапіць не можа.

***— Што ўяўляе сабой гэты нумізматычны кабінет?***

— Нумізматычны кабінет — збор манет ад антычнасці да сучаснасці. Ён з'явіўся ў 1964 годзе па ініцыятыве Валянціна Рабцэвіча. Валянцін Навумавіч скончыў аспірантуру ў Эрмітажы, у аддзеле нумізматыкі, і вярнуўся на гістарычны факультэт БДУ выкладаць. Сюды ён аддаў сваю нумізматычную калекцыю (з дзяцінства збіраў манеты) менавіта для заснавання такога нумізматычнага кабінета. Сама ідэя такіх кабінетаў старая: падобныя існавалі ў зборах буйнейшых арыстакратаў, у тым ліку беларускіх: Храптовічаў, Радзівілаў. А яшчэ ў XIX стагоддзі такія нумізматычныя кабінеты адкрываліся пры ўніверсітэтах. У Беларусі ж гэты нумізматычны кабінет быў першым, і дагэтуль з'яўляецца адзіным. Гэта не проста звычайны музей, у які ходзіць шмат людзей, гэта музей, які ў першую чаргу прызначаны для адукацыі студэнтаў. У ім праходзяць практычныя заняткі падчас курсу нумізматыкі, каб студэнт не толькі пачуў і паглядзеў малюнкі, але мог убачыць тыя манеты, пра якія яму расказваюць.

Кабінет складаецца з дзвюх частак: гэта так званая сістэматычная калекцыя (манеты ад антычнасці да сучаснасці, што выстаўлены ў храналагічным і тэрытарыяльным парадку) і скарбы, якія за час існавання кабінета былі сабраны з розных куткоў Беларусі рознымі шляхамі. Сюды трапіла больш за 30 скарбаў.

***— Якія экспанаты, на ваш погляд, найбольш цікавыя?***

— Самым выключным з'яўляецца Вішчынскі скарб. Ён быў здабыты падчас археалагічных раскопак — у гэтым яго шчаслівы лёс: ён цалкам трапіў у музей. У абсалютнай большасці скарбы знаходзяць выпадковыя людзі — сяляне, металадэтэктарысты, — а гэты знайшлі археолагі. Мала таго, што ён цалкам дайшоў да нас, гэты скарб яшчэ і вельмі рэдкі. Датуецца ён XIII стагоддзем. Апрача жаночых упрыгажэнняў, прысутнічаюць плацежныя зліткі (усё зроблена з серабра). Падобных скарбаў ва Усходняй Еўропе вядома толькі два-тры.

***— Ці ёсць у вас сапраўды рэдкія экспанаты, каб іншы музей мог пазайздросціць?***

— Так, у нас знаходзяцца абсалютна ўнікальныя манеты, якіх няма ні ў адным зборы. Ёсць манеты даволі рэдкія, якія ў свеце маюцца толькі ў некалькіх дзясятках экзэмпляраў.

***— Ці могуць да вас заходзіць усе ахвотныя?***

— Мы не прымаем індывідуальных наведнікаў, аднак могуць быць арганізаваныя групы: краязнаўчыя гурткі і інш.

***— Ці ёсць экспанаты, якія трапілі ў музей іншымі шляхамі, акрамя намаганняў спадара Рабцэвіча?***

— І нямала! Раней людзі былі... менш сапсаваныя грашыма, таму не сквапіліся на каштоўныя рэчы. Былі выпадкі, што прыносілі не проста шараговыя манеткі — аднойчы студэнтка падарыла залаты дукат. Цяпер гэта адбываецца значна радзей, аднак штосьці таксама прыносяць.

Мы нанова адчынялі гэты кабінет у 2010 годзе пасля рэканструкцыі, а напярэдадні абвясцілі збор манет. Прыносілі іх самыя розныя людзі: і нашы студэнты, і так званыя аматары прыборнага пошуку (адзін з іх падарыў вельмі рэдкую манету: дынарый, або пеназь Ягайлы — такой манеты ў нас яшчэ не было). Мы звычайна збіраем такую «даніну» і з замежных дэлегацый: просім пакінуць што-небудзь з іх драбязы — тое, што ёсць у кішэнях. Такім чынам пастаянна папаўняем калекцыю, аднак наш музей адрозніваецца ад іншых: мы не маем права набываць экспанаты, таму ўсе паступленні — выключна падарункі.


Скарб сярэбраных упрыгажэнняў.


Манеты часоў Жыгімонта II Аўгуста.

***— Вы з Валянцінам Рабцэвічам, пэўна, былі знаёмыя. Якім ён вам прыгадваецца?***

— Пра яго ў нас на факультэце застаецца самая светлая памяць — гэта быў цудоўны чалавек. Яго добра характарызуе такое слова, як «апантанасць» — ён ніколі не шкадаваў ні свайго часу, ні сваіх грошай. Часта сядзеў галодны, не меў за што купіць паесці, аднак ішоў і набываў рэдкую манету. За любую працу ён хапаўся так, што забываў практычна ўсё — нават падсілкавацца. Адзінае, што для яго было абавязковым, — гэта кава і папяросы — ён паліў і піў шмат кавы. Але працаваць мог амаль суткамі. Ён быў самаадданым чалавекам, зараз такія — вялікая рэдкасць.

***— Вы казалі, што чалавек навукі не можа быць калекцыянерам. Раскажыце, які падыход у навукоўца павінен быць да нумізматыкі?***

— Я ведаю матэрыяльную каштоўнасць гэтых манет, але яны мяне цікавяць у першую чаргу як узоры мастацтва, як сведчанні старажытнага грашовага абарачэння. Гэта значыць, я аналізую манеты, у той час як большасць калекцыянераў-нумізматаў проста глядзяць каталогі і высвятляюць, колькі каштуе манета і ці рэдкая яна. Мы ж аналізуем, якія асаблівасці ёсць у пэўнай групы манет. На падставе даследаванняў дзясяткаў людзей стварaюцца некалькі радкоў у падручніку, дзе пішацца, што ў такім-та стагоддзі былі такія грошы...

***— Ці ёсць сведчанні пра яшчэ не знойдзены скарб, які б вы марылі адшукаць?***

— Іх вельмі шмат, аднак я не займаюся скарбашукальніцтвам. Тое, што ёсць у крыніцах, усім вядома: скарб Напалеона, так званыя радзівілаўскія апосталы. Звычайна ёсць нейкія паданні ў вёсках, у якіх кажуць, што дзесьці закапаны скарб — такія мясцовыя байкі. Але каб гэтым займацца трэба мець шмат часу, быць вольным ад працы і, галоўнае, быць даволі мабільным: мець свой аўтамабіль, шмат грошай. Тады можна дазволіць сабе пастаянна ездзіць і шукаць скарбы. Натуральна, кожны марыць адшукаць скарб, у тым ліку археолаг.

У маім жыцці мне аднойчы пашчасціла знайсці скарб разам з маімі студэнтамі. Гэта позні скарб — манеты фашысцкай Германіі — быў схаваны ў 1944 годзе ў Гродзенскай вобласці. Знайшлі яго абсалютна выпадкова: ішлі з работ на раскопках, вырашылі скараціць шлях, пайсці праз поле — там і адшукалі. Большасць скарбраў так і знаходзіцца — выпадкова.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
**Фота аўтара.**

**Станаўленню нумізматыкі як навукі на Беларусі папярэднічаў працяглы перыяд збірання манет. Багатыя манетныя калекцыі меліся ў беларускіх магнатаў і шляхты, пачынаючы з XVI—XVIII стагоддзяў:**

✓Мікалай Радзівіл Чорны (1515—1585) меў першую вядомую на землях Беларусі калекцыю манет у Нясвіжы. Значную частку калекцыі складалі скарбы, якія знаходзілі сяляне, апрацоўваючы яго зямлю. Для манет былі зроблены дзве вялізныя шафы з шуфлядкамі. Усе манеты былі раскладзены па асобных ячэйках, абшытых аксамітам, размяшчаліся адпаведна краінам і месцу біцця. Пераважна тут былі манеты ВКЛ і Рэчы Паспалітай — дукаты, талеры, пенязі, шэлегі; арабскія, рымскія, галандскія і іншыя грашовыя знакі.

*✓Мікалай Радзівіл Сіротка (1549—1616) працягнуў збор калекцыі. У наноў збудаваным замку ў Нясвіжы Сіротка змясціў нумізматычную калекцыю ў спецыяльным пакоі.*

✓Крыху меншую, але таксама вялікую і славутую калекцыю старажытнасцяў мелі Сапегі. Так званы «Сапежынскі збор» у Ружанах змяшчаў нумізматычную калекцыю. Потым той збор дзяліўся паміж спадкаемцамі, асноўная частка была перавезена ў Дзярэчын. Пасля паўстання 1831 года калекцыю канфіскавалі. Далейшы лёс яе невядомы.

*✓Частка з Сапежынскага збору трапіла да Ганны Казіміраўны Сапегі (па мужы Яблонская) (1728—1800). Тая, жывучы ў Сямяцічах на Гарадзеншчыне, стварыла «Кабінет натуральнай гісторыі», дзе ў другой зале разам з вырабамі мастацтва была выстаўлена і нумізматычная калекцыя.*

✓Вядома, што Альжбета Агінская (? — 1767) у сваім маёнтку Лучай паміж Глыбокім і Паставамі збірала антыкварыят, плаціла сваім сялянам, калі яны знаходзілі ў зямлі старыя рэчы ці манеты.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТА НЕДВИЖИМОСТИ ЧУП «МИНСКАЯ МЕЖРАЙБАЗА ОПС»

**Организатор аукциона:** Частное унитарное предприятие «Научно-производственный центр Белкоопсоюза» (далее по тексту — ЧУП «НПЦ Белкоопсоюза»), г. Минск, пр-т Победителей, 17, 1001. Тел. (029) 318 37 22, (017) 226 99 92, (017) 226 91 19, (017) 226 99 22.

Аукцион проводится **4 октября 2012 г.** в 11 часов 00 минут по адресу: г. Минск, пр-т Победителей, 17 в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества организаций потребительской кооперации, собственником которого является Белкоопсоюз.

**Сведения о предмете аукциона:** ЗДАНИЕ МАГАЗИНА, площадью 56,7 кв.м, инв. № 600/С-125584. **Материал стен — бревенчатые обложенные кирпичом. Фундамент — бетонный. Крыша — шиферная. Печное отопление. Рядом находится сарай, пристройка и навес.**

Объект расположен на земельном участке, предоставленном на праве аренды площадью 0,0446 га с кадастровым номером 623685810601000016, по адресу: МИНСКАЯ ОБЛ., МИНСКИЙ Р-Н, РОГОВСКИЙ С/С, Д. КУКЕЛЕВЩИНА.

**Начальная цена продажи** — 102 000 000 (сто два миллиона) белорусских рублей с учетом НДС.

**Сумма задатка** — 5 100 000 (пять миллионов сто тысяч) белорусских рублей. **Условия продажи — нет.**

**Задаток перечисляется ЧУП «НПЦ Белкоопсоюза», р/с 3015201080017, УНН 100060419 ОКПО 14586268, ф-л МГД ОАО «Белагропромбанк» г. Минска, код 963.**

Срок и условия оплаты за объекты: определяются по согласованию победителя торгов с собственником имущества при заключении договора купли-продажи.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: **г. Минск, пр-т Победителей, 17, каб. 1004а, 1001, с 8.30 до 12.30 и с 13.30 до 17.30 в рабочие дни.** Прием документов заканчивается **в 17 часов 30 минут 2 октября 2012 г.**

К заявлению прилагаются следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о перечислении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в Извещении;

индивидуальными предпринимателями — резидентами Республики Беларусь — копия документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования и подлинник этого документа для проверки его соответствия копии;

юридическими лицами — резидентами Республики Беларусь — копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица, копия устава (учредительного договора — для коммерческой организации, действующей только на основании учредительного договора), без нотариального засвидетельствования и подлинник этого документа для проверки его соответствия копии;

индивидуальными предпринимателями — нерезидентами Республики Беларусь — легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык;

юридическими лицами — нерезидентами Республики Беларусь — легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть оформлена не ранее чем за шесть месяцев до даты подачи заявления) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица — также документ, подтверждающий его полномочия.

Представителем заявителя (кроме случая, когда юридическое лицо представляет его руководитель) предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости (для представителя иностранного юридического лица) легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

**Сведения о продавце:** ЧУП «Минская межрайбаза ОПС», 220036, г. Минск, 3-й загородный пер., 4а. Тел. (017) 208 37 57, (029) 357 31 60.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты, связанные с организацией и проведением аукциона. После совершения победителем аукциона (претендентом на покупку) названных платежей продавец заключает с ним договор купли-продажи предмета аукциона в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ ОБЪЕКТА ДОЛЕВОГО СТРОИТЕЛЬСТВА

### «14-16-этажный жилой дом типовых потребительских качеств № 26 (по генплану) со встроенно-пристроенными объектами обслуживания в микрорайоне Каменная Горка-5»

**Информация о Застройщике**

Заказчик – СООО «Восточная строительная компания», зарегистрировано Минским горисполкомом 13.12.2010 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190565789.

Адрес застройщика: 220035, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Гвардейская, д. 16, пом. 2Н; т./ф. 203-71-73.

Режим работы: понедельник-пятница с 9.00 до 17.30, обеденный перерыв с 13.00 до 13.30.

В период с 2007 г. по 2009 г. предприятие выступало генподрядчиком при строительстве двух многоэтажных жилых домов в г. Минске по ул. Крупской с устройством административных помещений в цокольных этажах.

**Информация о проекте**

Цель проекта – строительство жилого дома со встроенными помещениями многоцелевого назначения. Предметом договора является долевое строительство жилого помещения.

Строящийся жилой дом расположен на землях Фрунзенского административного района г. Минска в микрорайоне «Каменная Горка-5» на земельном участке площадью 0,9163 га, находящемся в собственности Республики Беларусь и предоставленном СООО «Восточная строительная компания» во временное пользование на период строительства.

Земельный участок, предоставленный для строительства объекта, ограничен: с севера – улицей Казимировская, с юга – границей строящегося жилого дома № 15 по генплану, с запада – границей строящегося жилого дома № 17 по генплану, с востока – улицей Неманская.

Нормативная продолжительность строительства жилого дома 36,8 месяца.

Предполагаемый срок ввода жилого дома в эксплуатацию – IV квартал 2012.

**Объект долевого строительства** – 6-подъездный, 14-16-этажный, 308-квартирный жилой дом со встроенными на первых этажах помещениями административного и общественного назначения общей площадью 2985,1 кв.м, техническим подпольем и «теплым» техническим чердаком, пассажирскими и грузопассажирскими лифтами. Высота жилых помещений (пол-потолок) – 2,7 м, административных – 3,0 м.

Конструкция здания – монолитный железобетонный каркас с плоскими монолитными перекрытиями с сеткой колонн, наружные стены из блоков ячеистого бетона, окна из ПВХ-профиля с двухкамерными стеклопакетами. Наружная и внутренняя отделка решена на основе применения современных отделочных материалов и конструкций.

**Благоустройство участка** включает подъезд к дому, автомобильную стоянку на 121 машино-место, плиточное покрытие пешеходных связей, детские площадки общей площадью 153 кв.м и площадки для отдыха взрослого населения 40 кв.м, озеленение территории с установкой малых архитектурных форм.

**Жилые помещения:** все квартиры располагаются на 3-14 (16) этажах. Общая площадь жилой части дома составляет 18 557 кв.м. Всего 308 квартир.

Для привлечения физических лиц, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц и индивидуальных предпринимателей к строительству по договорам создания объекта долевого строительства в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 15.06.2006 № 396 предлагается 59 (Пятьдесят девять) квартир, со стоимостью за 1 кв.м. 10 300 000 белорусских рублей, из них:

• однокомнатных – 18 квартир, максимальной площадью 41,55 м²;

• двухкомнатных – 8 квартир, максимальной площадью 63,94 м²;

• трехкомнатных – 23 квартир, максимальной площадью 81,09 м²;

• четырехкомнатных – 10 квартир, максимальной площадью 123,84 м².

В зависимости от типа квартир, размера первоначального и сроков внесения последующих платежей **применяется гибкая система скидок**.

- Строительная готовность жилых помещений:
- штукатурка стен (без окраски стен и потолков);
- бетонная подготовка под полы (без покрытия);
- двери: входные – деревянные, внутренние – не устанавливаются;
- монтаж электропроводки согласно проектной документации с установкой счетчиков учета эл.энергии;
- горячее и холодное водоснабжение – стояки с приборами учета;
- канализация – монтаж канализационных стояков с подключением одного унитаза;
- монтаж системы отопления с установкой радиаторов;
- вентиляция – вытяжная естественная;
- телефонизация, радиофикация, телевидение – согласно проекта.

Строительная готовность помещений общего пользования (тамбур, вестибюль, лифтовые холлы, лестничные клетки, коридоры и др.) – стопроцентная чистовая отделка.

